НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКАЯ ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА САВЕЦКАГА САЮЗА — ПАЛІТЫКА МІРУ І ДРУЖБЫ НАРОДАЎ, ЗГУРТАВАННЯ ЎСІХ СІЛ, ЯКІЯ ЗМАГАЮЦЦА СУПРАЦЬ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ, РЭАКЦЫІ І ВАЙНЫ!

НЯХАЙ ПЕРАМАГАЮЦЬ ІДЭІ ПРАГРАМЫ МІРУ, ВЫПРАЦАВАНАЙ XXIV З'ЕЗДАМ КПСС!

(З Заклікаў ЦК КПСС да 56-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі)

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ВЫДАЕЦЦА З 1932 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 43 (2674) ● ПЯТНІЦА, 26 кастрычніка 1973 г. ● Цана 8 кап.



ЗА МІР, ЗА БЯСПЕКУ НАРОДАЎ!

Адкрыццё Сусветнага кангрэса міралюбівых сіл

Сталіца Савецкага Саюза — Масква ў шматкаляровасці флагаў і транспарантаў. Ад усяго сэрца, цёпла і гасцінна вітае яна ўдзельнікаў форуму міралюбівых сіл. Да Масквы сёння накіроўваюцца позіркі і думы мільёнаў людзей добрай волі, усіх, каму дораг мір на зямлі. Тут, у Маскве, 25 кастрычніка адкрыўся Сусветны кангрэс міралюбівых сіл.

У Маскву на Сусветны кангрэс міралюбівых сіл прыехала каля 3.200 дэлегатаў са 144 краін. Яны прадстаўляюць каля 1.100 палітычных партый, арганізацый і рухаў. На кангрэсе — кіраўнікі і прадстаўнікі 121 міжнароднай і рэгіянальнай арганізацыі.

Крамлёўскі палац з'ездаў. 16 гадзін. Велізарную, залітую агнямі залу палаца запоўнілі дэлегаты і госці кангрэса.

У прэзідыуме — цёпла сустрэтыя прысутнымі члены Міжнароднага падрыхтоўчага камітэта, кіраўнікі міжнародных арганізацый і рухаў, вядомыя барацьбіты за мір.

Працяглымі апладысментамі, стоячы, дэлегаты і госці кангрэса сустрэлі таварышаў **Л. І. Брэжнева, А. А. Грамыку, А. П. Кірыленку, А. М. Касыгіна, Ф. Д. Кулакова, К. Т. Мазурава, А. Я. Пельшэ, М. В. Падгорнага, Д. С. Палянскага, А. М. Шалепіна, П. М. Дземічава, Б. М. Панамарова, Д. Ф. Усцінава, У. І. Далгіх, І. В. Капітонава, К. Ф. Катушава,** якія занялі месцы ва ўрадавай ложы.

Уступным словам кангрэс адкрывае намеснік старшыні Міжнароднага падрыхтоўчага камітэта, прэзідэнт Міжнароднага бюро міру **Шон Макбрайд.** Ад імя Падрыхтоўчага камітэта ён вітае ўсіх удзельнікаў Сусветнага кангрэса міралюбівых сіл. Гэты кангрэс, сказаў Шон Макбрайд, — самы буйны і самы знамянальны кангрэс няўрадавых арганізацый і міралюбівых сіл, які калі-небудзь меў месца.

Прамоўца прапанаваў, каб прэзідэнтам кангрэса быў старшыня Міжнароднага падрыхтоўчага камітэта, генеральны сакратар Сусветнага савета міру Ромеш Чандра.

Пад апладысменты дэлегатаў Шон Макбрайд выказаў шчырую ўдзячнасць Савецкаму падрыхтоўчаму камітэту за работу, якую ён правёў у перыяд падрыхтоўкі кангрэса, за цёплы прыём, аказаны ўдзельнікам сусветнага форуму савецкім народам.

Выступае старшыня Міжнароднага падрыхтоўчага камітэта, генеральны сакратар Сусветнага савета міру **Ромеш Чандра.**

Падзякаваўшы за высокі гонар старшынствацьь на гэтым кангрэсе, Ромеш Чандра гаворыць:

Паважаныя дэлегаты, сябры і саратнікі па барацьбе за справу міру, нацыянальную незалежнасць, бяспеку, справядлівасць і сацыяльны прагрэс.

Дарагі таварыш Брэжнеў!

Дарагія кіраўнікі Урада!

Тут прысутнічаюць кіраўнікі Урада і Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Тут прысутнічаюць прадстаўнікі народаў Савецкага Саюза, і мы пачынаем гэты кангрэс, вітаючы іх за ініцыятыву, якую яны праявілі ў справе абароны міру і справядлівасці ва ўсім свеце. (Апладысменты).

Сусветны кангрэс міралюбівых сіл падрыхтаван і ікан тысячамі арганізацый, партый і груп як міжнародных, так і нацыянальных і мясцовых. Ніколі яшчэ ва ўсёй гісторыі чалавецтва, якое імкнулася да выключэння войнаў з жыцця грамадства і да вызвалення ад прыгнечання і эксплуатацыі, не праводзіўся такі кангрэс. Гэты кангрэс можна з усёй справядлівасцю назваць першай Генеральнай Асамблеяй народаў свету. (Апладысменты).

Чаму гэты кангрэс нельга было склікаць раней? Што зрабіла магчымасць скліканне такога шырокага сходу? Адказ на гэта пытанне просты і ясны. Кангрэс такога тыпу мог быць склікан толькі ў цяперашні перыяд, калі ў міжнароднай абстаноўцы ўстанавіўся новы клімат, які характарызуецца перамогамі ў справе міру, разрадкай напружанасці, мірным суіснаваннем, нацыянальнай незалежнасцю і міжнароднай бяспекай.

Сёння, працягвае Р. Чандра, мы думаем перш за ўсё аб в'етнамскім народзе і аб той вялікай перамозе, якую ён атрымаў з падпісаннем мірнага пагаднення. (Апладысменты). Гэта перамога не толькі народа В'етнама, але і народаў усёй зямлі. Сёння слова В'етнам аднолькава гучыць на ўсіх мовах свету. Яно не мае патрэбы ў перакладзе, яно азначае: мір, незалежнасць. Гэта слова азначае, што, нават звярнуўшыся да самай варварскай імперыялістычнай агрэсіі, нельга знішчыць народ, які карыстаецца падтрымкай іншых народаў, мільёнаў людзей добрай волі.

Сёння мы думаем аб арабскіх народах, якія на працягу многіх гадоў знаходзяцца перад тварам агрэсіі. Мы думаем аб народзе Палесціны, выгнаным з уласнага дома. На Блізкім Усходзе лютуе вайна. У гэты час страчваюцца дарагія жыцці. Маленькія дзеці, такія ж, як вашы ўласныя, ледзь навучыўшыся лепятаць бездыханнымі ляжаць у Дамаску і Суэцы, забітыя бомбамі і кулямі, выраблены мі на тых жа заводах, якія выраблялі зброю для забойства дзяцей у В'етнаме.

У гэты дзень, калі наш кангрэс пачынае работу, мы добра ўсведамляем вялікую адказнасць, якая ляжыць на нас. Народы свету могуць і павінны выступіць у падтрымку руху за мір і шчасце, выступіць за спыненне агрэсіі, за вяртанне арабскіх зямель арабскім народам, за аднаўленне законных правоў народаў Палесціны. (Апладысменты).

Мы думаем аб Чылі, якая стала ахвярай дзікага фашысцкага перавароту, краінай, дзе адбываюцца масавыя забойствы, катаванні і зверствы, краінай канцэнтрацыйных лагераў. Сёння нашы сэрцы з Чылі, нашы сэрцы з удзельнікамі супраціўлення ў Чылі. (Апладысменты). І няхай гэты кангрэс абвесціць: Чылі жыве, і фашысцкая хунта ніколі не пераможа! (Апладысменты).

Сёння мы думаем пра Сальвадора Альендэ і Пабла Няруду (Апладысменты. Усе ўстаюць), якіх мы ведалі, чые рукі мы паціскалі, у чые вочы мы глядзелі. Сцяг прэзідэнта Сальвадора Альендэ стаў сцягам кожнага народа, які імкнецца пабудаваць новае жыццё, імкнецца ўзяць уласныя рэсурсы ва ўласныя рукі, каб дзеці яго ніколі не ведалі голаду.

Р. Чандра з глыбокім хваляваннем гаворыць пра сусветна вядомага чылійскага паэта Пабла Няруду і цытуе яго вершы.

Сёння мы думаем, працягвае прамоўца, аб усіх народах свету, народах Еўропы, якія імкнуцца стварыць сістэму бяспекі і супрацоўніцтва і пакласці канец падзелу гэтага вялікага кантынента на процістаячыя адзін другому ваенныя блокі.

Я думаю аб народах Азіі, аб народзе майго кантынента, аб яго вялікай барацьбе супраць імперыялістычнага панавання і эксплуатацыі, супраць неакаланіялізму.

Я думаю аб нягодах Афрыкі, вялікай новай Афрыкі, якая нядаўна стала незалежнай, гордай, ідзе наперад, да таго, каб пакончыць з апошняй апорай імперыялізму і прыгнечання і даць народам свабоду.

Мы думаем аб народзе Злучаных Штатаў Амерыкі, які, падобна на ўсе іншыя народы на зямлі, вядзе барацьбу за стварэнне новага свету, гаворыць далей Р. Чандра. Мы вітаем новую Амерыку, сапраўдную Амерыку, якая ідзе наперад побач з народамі свету. (Апладысменты).

Я думаю перш за ўсё, гэтак жа як і вы ўсе, аб народзе вялікай краіны, у якой мы сабраліся,— аб Савецкім Саюзе. Якая цудоўная гэта краіна, як аддана яна справе міру! Мільёны савецкіх людзей прынялі ўдзел у падрыхтоўцы нашага кангрэса. І гэта не здзіўляла нас, бо з таго самага дня, калі ўзнікла савецкая дзяржава, яна паставіла мір у аснову праграмы сваёй дзейнасці. Савецкі Саюз сваімі нястомнымі намаганнямі за мір і міжнародную разрадку, за перамогу прынцыпаў мірнага суіснавання, за перамогу ўсіх народаў змагаўся за нацыянальную незалежнасць, унёс выдатны ўклад у стварэнне цяпер існуючага новага клімату ў міжнароднай абстаноўцы.

Ад імя ўсіх дэлегатаў, сказаў Р. Чандра, я хачу яшчэ раз выказаць сардэчную ўдзячнасць савецкаму народу, савецкаму Ураду, Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і асабіста Леаніду Ільічу Брэжневу за вялікую ўвагу, праяўленую да кангрэса і асабісты ўдзел у ім. (Апладысменты).

Цяперашні кангрэс — гэта не толькі кангрэс абаронцаў міру, гэта таксама кангрэс будаўнікоў міру. Якую слаўную перспектыву ён адкрывае перад намі ў стварэнні ўмоў будаўніцтва і забеспячэння новага свету!

●

Шон Макбрайд, які выступіў затым, паведамляе, што ў адрас кангрэса паступілі шматлікія прывітанні.

Старшынствуючы Ромеш Чандра дзякуе ўсім тым, хто накіраваў прывітанні ў адрас кангрэса.

Кангрэс вітае ад імя Генеральнага сакратара ААН **Курта Вальдхайма** памочнік Генеральнага сакратара ААН **Хабіб Хара,** ад Арганізацыі Афрыканскага Адзінства намеснік Генеральнага сакратара ААА **Пітэр Ону,** ад ЮНЕСКА асабісты прадстаўнік Генеральнага сакратара ЮНЕСКА **П'ер Лібар.**

Ад Сусветнай Федэрацыі прафсаюзаў кангрэс міралюбівых сіл вітае Генеральны сакратар СФП **П'ер Жансус,** які зачытаў пасланне Восьмага сусветнага кангрэса прафсаюзаў.

26 кастрычніка кангрэс працягне работу.

ТАСС.

УЗНАГАРОДЫ АРТЫСТАМ

Больш за 10 разоў выязджаў з гастролямі на Украіну Дзяржаўны народны аркестр БССР пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР прафесара І. І. Жыновіча. Яму апладзіравалі ў Кіеве і Харкаве, Данбасе і Закарпацці.

20 канцэртаў у брацкай рэспубліцы дадуць у пачатку новага года «Песняры». Ансамбль штогод выязджае з канцэртамі на Украіну. Шмат разоў выступаў перад украінскімі гледачамі і Дзяржаўны ансамбль танца БССР.

Асаблівы поспех выпаў на долю нашых калектываў у дні фестывалю мастацтваў народаў СССР «Кіеўская вясна».

За актыўны ўдзел у «Кіеўскай вясне», плённую работу па прапагандзе дасягненняў савецкага мастацтва сярод працоўных, за вялікі ўклад у справу збліжэння і ўзаемаўзбагачэння культур брацкіх народаў Дзяржаўны народны аркестр БССР, Дзяржаўны ансамбль танца БССР і вакальна-інструментальны ансамбль «Песняры» ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета Украінскай ССР. Па даручэнню Прэзідыума Вярхоўнага Савета УССР граматы калектывам уручыў намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Ф. Клімаў.

БЕЛТА.

ПЕСНЯЙ ЗАКЛІКАНЫ

У пачатку лістапада ў гастрольную паездку па краінах Паўднёва-ўсходняй Афрыкі выязджае група артыстаў савецкай эстрады. Беларусь у ёй будуць прадстаўляць заслужаны артыст БССР Віктар Вуячыч і вакальна-інструментальны ансамбль «Тоніка». Лепшыя песні савецкіх кампазітараў, народныя рускія і беларускія песні ў выкананні нашых артыстаў прагучаць у Сенегале, Маўрытаніі, С'ера-Леоне і іншых краінах. Спецыяльна для гэтай паездкі В. Вуячыч падрыхтаваў некалькі песень на англійскай і французскай мовах. Пачуюць слухачы і «Памяць сэрца» І. Лучанка, якая трывала ўвайшла ў рэпертуар спевака пасля Усесаюзнага конкурсу на лепшае выкананне савецкай песні, дзе артыст заняў першае месца. Выконвае яе Вуячыч пранікліва, шчыра, па-майстэрску выкарыстоўваючы ўсе адценні свайго голасу. Створаны ім вобраз партызанскага ветэрана напоўнен высокай мужнасцю, гучыць як заклік, як клятва ад імя сучаснікаў. Даўняя творчая дружба ў спевака з кампазітарам, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Ігарам Лучанком. В. Вуячыч — першы выканаўца яго лепшых песень.

Спевака прываблiваюць творы, прасякнутыя палымянай публіцыстычнасцю, патрыятычным пафасам. Таму галоўнае месца ў яго рэпертуары аддадзена песням, у якіх чуецца і «Рэха мінулай вайны», і поступ сённяшніх дзён. А побач з імі шырока гучаць пяшчотныя лірычныя творы аб каханні і дружбе, прыгажосці роднага краю. Лёс саліста, асабліва вядомага — вечныя дарогі. Шмат іх было і ў лаўрэата ўсесаюзнага і міжнародных конкурсаў Віктара Вуячыча. У гэтым годзе ён выступаў у Маскве, Кіеве, Львове, Севастопалі, у Токіо на міжнародным традыцыйным конкурсе сучаснай эстраднай песні, дзе атрымаў вялікі спецыяльны прыз за выкананне «Спадчыны» І. Лучанка, на Алтаі ў час свята беларускага мастацтва, на фестывалі «Крымскія зоры».

Расказваючы аб сваіх планах, аб маючых адбыцца гастролях, спявак прызнаўся, што вельмі хвалюецца перад паездкай.

— Выступаць давядзецца перад новай, непрывычнай аўдыторыяй, — сказаў В. Вуячыч, — і мы не ведаем, як прымуць і зразумеюць нашы песні, наш музычны расказ аб савецкіх людзях, аб Краіне Саветаў, аб маёй роднай Беларусі. Вельмі хочацца, каб яны зразумелі нас, забылі пра адлегласці і палюбілі нашу песню, наша мастацтва.

З. ФЕДЧАНКА.
БЕЛТА.

Гэтыя кветкі паднеслі Сабіне Сцяпанаўне Пракопчык і Антаніне Нікадзімаўне Шышко ва Усесаюзны дзень работнікаў сельскай гаспадаркі іх таварышы па рабоце. Паднеслі, як даніну павагі, як прызнанне заслуг сціплых працаўніц.

Нямала гадоў працуюць абедзьве жанчыны даяркамі на Зарыцкай малочна-таварнай ферме вучгаса «Прынёманскі» Гродзенскага раёна. Працуюць выдатна, самааддана. Толькі за 9 месяцаў сёлетняга года кожная з даярак надаіла ад каровы па 3600 кілаграмаў малака, выканаўшы гадавое абавязацельства.

За высокія паказчыкі ў рабоце С. Пракопчык нядаўна была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а А. Шышко — медалем «За працоўную адзнаку».

Фота В. ГОФМАНА.

ПІСАЦЬ ПРА СУЧАСНІКА

Адбыўся сход партыйнай арганізацыі СП БССР.

Камуністы заслухалі і абмеркавалі даклад Л. Прокшы «Творчыя камандзіроўкі і іх вынікі». У спрэчках па пытанню, якое было пастаўлена на абмеркаванне, выступілі П. Панчанка, М. Гроднеў, Ул. Юрэвіч, А. Савелічаў, Ф. Міхееў, С. Кухараў, А. Мацкевіч, А. Марціновіч.

У прынятай партыйным сходам пастанове падкрэсліваецца своечасовасць узнятай гаворкі. Камуністы звярнулі ўвагу кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў на неабходнасць больш рацыянальна выкарыстоўваць творчыя камандзіроўкі — гэты важны сродак умацавання сувязі пісьменнікаў і перыядычных літаратурных выданняў з жыццём.

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

Гарадскі конкурс выканаўцаў сучаснага бальнага танца адбыўся ў Маладзечна. Яго пераможцы выступяць на абласным конкурсе.

□

Вечар маладога настаўніка прайшоў у Пінску. З наказам ветэранаў сваім маладым калегам выступіла заслужаная настаўніца БССР Т. Ф. Корж. Пачынаючыя педагогі далі клятву вернасці прафесіі, справе, якой вырашылі прысвяціць жыццё.

□

Тры дні Мінскі дом мадэлей будзе дэманстраваць у Маскве навінкі беларускай моды асенне-зімовага сезона на паказе навейшых мадэлей адзення, абутку і галаўных убораў. Паказ праводзіць Усесаюзны інстытут асартыменту вырабаў лёгкай прамысловасці. У ім прымуць удзел таксама мадэльеры з многіх гарадоў краіны.

□

Больш як дзесяць фільмаў аб сваім прадпрыемстве стварыла аматарская кінастудыя Баранавіцкага баваўнянага камбіната. Цяпер кінааматары здымаюць фільм аб зялёнай зоне, створанай вакол камбіната.

БЕЛТА.

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

За творчыя поспехі і актыўны ўдзел у мастацкім абслугоўванні насельніцтва калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла званне народных тэатру Гомельскага клуба Беларускага таварыства глухіх і ансамблю пантамімы «Рух» рэспубліканскага палаца культуры Беларускага таварыства глухіх.

ВЕСТКІ З БРЭСТЧЫНЫ

КНІГІ ПА ЗАКАЗУ

Добра працуе міжбібліятэчны абанемент Іванцэвіцкай раённай бібліятэкі. З пачатку года тут выканана 73 заказы. Па просьбе чытачоў бандэролі з кнігамі дасылаюць у Іванцэвічы Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна, бібліятэка Акадэміі навук БССР, Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага.

ЦІКАВАЯ ВЫСТАЎКА

На Баранавіцкай фабрыцы мастацкіх вырабаў арганізавана выстаўка твораў самадзейных мастакоў і народных умельцаў. Тут экспануецца звыш трохсот работ.

Увагу наведвальнікаў выстаўкі прыцягваюць па-мастацку выкананыя работы ўмельцаў Ул. Курчава, А. Грыгор'ева, А. Сяледчанкі, Л. Ярохінай і іншых.

ФІЛІЯЛЫ ШКОЛЫ

У вёсках Макраны і Олтуш адкрыты філіялы Маларыцкай музычнай школы. У іх вучацца звыш дваццаці дзяцей. Выкладчыкамі музыкі тут працуюць Марыя Любчык, Надзея Уласава, Леанід Казлоўскі і Яраслаў Пашкевіч.

Філіялы музычнай школы плануецца стварыць у вёсках Чарняны, Пажэжын і іншых.

НОВЫ ДОМ КУЛЬТУРЫ

Пашыраецца культурна-бытавое будаўніцтва ў калгасе «Зара камунізма» Іванаўскага раёна. Тут узведзена тыпавая сталовая, будуецца магазін, які будзе працаваць па метаду самаабслугоўвання.

Нядаўна ў калгасе вырас прыгожы будынак дома культуры.

БЯЛГРАД

АПЛАДЗІРАВАЎ ЮНЫМ

Група юных самадзейных артыстаў народнага ансамбля песні і танца Магілёўскага палаца піянераў і школьнікаў вярнулася са сталіцы Югаславіі — Бялграда, дзе паспяхова выступіла на Усеёўрапейскім фестывалі «Радасць Еўропы».

Цёпла прымалі гледачы рускія, беларускія, югаслаўскія народныя песні і танцы, якія з вялікім майстэрствам выконвалі Іна Кавальчук, Лена Жыгунова, Ірына Ухватава, Вася Пячэня, іншыя ўдзельнікі ансамбля.

Калектыву ў мінулым годзе споўнілася пятнаццаць гадоў. У ім змянілася не адно пакаленне артыстаў, але нязменным засталося высокае выканаўчае майстэрства юных аматараў песні і танца. Летам юныя артысты з поспехам выступілі на ВДНГ СССР і былі ўзнагароджаны дыпломам дырэкцыі выстаўкі. Цяпер ансамбль пад кіраўніцтвам вялікага аматара дзіцячай творчасці Р. Е. Шацава рыхтуе новую праграму, з якой выступіць у гарадах і вёсках Магілёўшчыны.

БЕЛТА.

Міхась ВЫШЫНСКІ

ШЧАСЦЕ РЫБАЦКАЕ

«ЗНАЧЫЦЬ, ноччу выходзім...» З гэтай сцішана-радаснай думкай я кладуся на салому спаць, і, знябыўшыся за дзень, імгненна засынаю. І вось ужо — здаецца ж, толькі звёў вочы! — хтосьці турботна тармосіць мяне за плячо:

— Час, пад'ём, — і сон адлятае спуджанай птушкай.

Гадзіна ночы. У прыазёрнай хаціне гарыць святло, дружна шамацяць, апранаючыся, адзеннем рыбакі. Усе спакойныя, дзелавітыя, а я хвалююся: гэтая рыбацкая ноч першая на маім жыцці, дзеля яе і застаўся ўчора. Хапатліва апранаюся: нацягваю цяжкія штаны-ватовікі, куфайку. Улажу нагамі ў шырокія і глыбокія, быццам калодзежы, гумовікі з адвернутымі халяўкамі і ўважліва, нібы за час сну што з імі прычынілася, аглядаю сваіх прыяцеляў, нарачанскіх рыбакоў. Няўрымслівага Мікалая Лявонцьевіча Варанца, брыгадзіра (гэта ён, аказваецца, падняў усіх на ногі), спаважнага Івана Міхайлавіча Мурзо і Міхаіла Міхайлавіча Кароткага, старэйшых рыбакоў, і маладзейшых Валянціна Аблама і Рыгора Чарненку. Уся варанецкая брыгада на месцы — кожны з пяці гатоў да начной лоўлі-работы.

Скотваем у пук салому з падлогі, і ціха, каб не разбудзіць гаспадароў, выходзім з хаты.

Ноч нечакана месячная, ядраная ад марозіку і, хаця мы цёпла адзеўшыся, зябкая дрыготка зводзіць плечы. Пад нагамі суха шуршыць схопленая інеем трава, пара ад дыхання светлымі плоткамі снуе ў месячным паўзмроку. Ажно не верыцца, што ўчора праз дзень шалеў вецер, несціхана сцёбаў дождж, і ўсё ў наваколлі глухла ў туманнай смузе.

— Пагодка, браткі, чысты званок, — усцешана пацірае рукі брыгадзір, — і ціхата, як шкло,—невысокі, жылаваты, ён з блаславёнай усмешкай паглядае на возера.

Сапраўды, Баторына ціхаціха, хоць бы дзе маршчынка на светлым чале, дрэмле між сасновага бору і вёскай Шыкавічы. І толькі пад берагамі ў алешніку і сітнягу коратка хліпае хвалямі, азыравата дыхае туманам. У гэтым тумане ледзь прыкметна выцемніваюцца тры нашы лодкі.

Што й казаць, няма большай радасці для рыбаловаў, як такое надвор'е. Не трэба баяцца, што хвалі зальюць лодкі і што занясуць яны куды пад бераг невад.

Нетаропка спускаемся, нацягваючы рукавіцы, з надбярэжнага пагорка. Знімаемся з якараў і, боўтаючы вадой, залазім у лодкі. У першую з навясным маторам забіраюся я з Варанцом, у астатнія Мурзо з Абламам, Кароткі з Чарненкам. Выбіраю коўшыкам з дна лодкі ваду, памінутна аглядаюся. Пахне туманам, падапрэлым лісцем і бузой. Прыходзіць дзіўнае адчуванне адасобленасці ад свету. Здаецца, што нічога, апрача месяца, рыбакоў ды лодак з лябёдкамі і невадам, няма наўкола. Разумею, што ў гэтым вінен туман, які абрэзаў, звузіў свет да невялікага люстэрка вады. Стоенае хваляванне і ўзрушэнне не праходзяць...

От ужо Мікалай Лявонцьевіч бярэцца за вёслы, прызыўна абзываецца да таварышаў, і лодкі адна за адной мкнуць на сярэдзіну возера. Месячнае святло ўздрыгвае, дробіцца на срэбныя друзалкі і глухне ў вадзяным мораку. Гонка і прывідна ляцяць за лодкамі іх цені-двайнікі. Усё ў гэтую хвіліну выдае нейкім нерэальным, бязважкім: і цені, і месяц, і рыбакі, і лодкі...

На сярэдзіне возера, на самым глыбокім яго месцы (я да знобкасці адчуваю яго настылае дзесяціметровае прадонне) лодкі спыняюцца і па камандзе Варанца Мурзо з Кароткім кідаюць за борт «куль» невада і раз'язджаюцца ў процілеглыя бакі, расцягваючы паўмесяцам капронавую снасць. Відаць як на вадзе зыбаюцца чорныя галоўкі паплаўкоў. А лодкі ўсё разыходзяцца і разыходзяцца, шырай і шырай захопліваючы крылам! невада прастору возера.

Вось ужо невад расцягнуты на ўсю сваю пяцісотметровую даўжыню. Пранізлівым глыбінным холадам вее возера. І мне аж не верыцца, што ў гэты момант крылле невада, якое толькі што ляжала ў лодцы, плыве, грузне недзе ў бузе азёрнага дна...

Брыгадзір тым часам гоніць лодку паўз паплаўкі, зорка ўглядаецца ў іх і задаволена ківае галавой: невад ідзе як трэба. Я заўважаю, як цяжка будзе неўзабаве выбіраць яго. Варанец толькі пасміхаецца, супакойвае: на гэта ёсць лябёдкі.

Весляры звужаюць круг, прыцішаюць ход лодак, і раптам у начной цішы ўскідваецца спеў лябёдак — выбіраюцца леры. От ужо лодкі сыходзяцца, лябёдкі змаўкаюць, і з вады нібы сама сабой выплывае сетка. Разгарачаныя работай, рыбакі гучна, нібы баючыся, што не пачуюць адзін аднаго, перагаворваюцца (так яны гавораць заўсёды і ўсюды: гэтую звычку выпрацавала ў іх праца, за якой ім даводзіцца перакрываць шум ветру, хваль і матораў). Я далёка не ўсё разумею ў іх гамонцы. Ясна адно: цяпер людзям трэба сетку выбіраць рукамі.

Варанец пераходзіць у лодку да Мурзо, і мужчыны, натужна сапучы, у тры пары рук увішна выцягваюць снасць. Я, як і астатнія двое рыбакоў, сяджу на вёслах, не даючы вадзе зносіць ад невада лодку. Мільгаюць у паўзмроку цёмныя натруджаныя рукі, блішчаць мокрыя фартухі, булькоча, са звонам цурчыць пад бартамі вада. Раптам у ячэйках невада жывым срэбрам загараецца луска рыбы. У лодку пад ногі мне ляцяць цельпукаватыя і тоўстыя, як плашкі, сазаны, лящы, карасі. Яны лупяць хвастамі, сутаргава хаўкаюць, ловячы паветра, круцяцца, як на раскаленай патэльні. Галасы людзей жвавеюць і святлеюць: улоў, па ўсім відаць, багаты. Так і ёсць: сетка ўсё цягнецца і цягнецца з вады, і ўсё ляціць мне пад ногі рыба, пераважна сазан і лешч. Неўзабаве жывое срэбра затапляе мала не трэць лодкі. Ашаломлены, радасна разгублены, сяджу сярод яго як чалавек, да якога нечакана прываліла казачнае багацце...

Калі выбралі невад, Варанец заводзіць матор, бярэ на буксір астатнія лодкі і адводзіць іх да берагу. Тут мы згружаем здабычу ў спецыяльныя скрыні, прыкідваем на вока: выходзіць, што ўлоў наш заважыць недзе за трыста кілаграмаў. Нядрэнна для пачатку...

Значыць, праў быў Варанец, калі тыдзень назад парашыў перабрацца рыбачыць з Нарачы сюды на Баторына, на невялікае возера за Мядзелем. Тут нават у непагадзь адносна спакойная хваля (не параўнаеш з нарачанскай!), можна нармальна працаваць, і рыбы, канечне, больш, бо з вясны не закідвалі невада. Хаця і тут, як і на Нарачы, асабліва вялікай здабычы на ўсю восень чакаць не выпадае: настаюць халады, рыба, аджыраваўшы, імкне ў глыб вадаёма, шыецца ў бузу. Але можа быць і выключэнне... Варанец, патомны нарачанскі рыбак, ведае Баторына, як свае пальцы, і калі да гэтых ведаў прыкласці рыбацкую кемлівасць і ўмельства, то, глядзіш, і будзе тут браць не горшы, чым летам, улоў: па 4 тоны рыбы на месяц.

Яшчэ два разы мы выходзім на возера, закідваем невад, і кожны раз нам шанцуе, як у першы заход.

На ўсходзе сонца варанянцы плывуць пад далёкую набярэжную вёсачку, выбіраць стаўныя сеткі, якія закінулі яшчэ з вечара, я з Мікалаем Лявонцьевічам застаюся на беразе варыць на сняданне баторынскую юшку. Падцягнуты і сухарлявы (гэтая жылаватая сухарлявасць ды падборыстасць характэрна, як прыкмеціў, для ўсіх рыбакоў), з пільным позіркам шэрых вачэй Варанец заліває ёмісты саган вадой, жвава, нібы і не напрацаваўся за ноч, распальвае касцёр.

— Ты гэта, браток, абірай, абірай бульбачку, — прыспешвае мяне, — трэба ж, бо, покі яны там управяцца, — ківае ў бок лодак, — згатаваць варыва, — бярэ нож і з зайздросным спрытам пачынае чысціць рыбу.

Касцёр пад ранішнім ветрыкам шыбка разгараецца, шугае іскрамі пад неба.

— От так і жывём: ад ранішняга кастра да вячэрняга, — надрахоўвае нейкія невядомыя мне думкі стары рыбак і ўздыхае. — Як тыя цыганы: сёння тут, заўтра там. Сёння на Баторыне ядзім юшку з камармі, заўтра скажам, на Свіры ці на Вялікай Швакшце... Усе Мядзельскія азёры, браток, сплавалі ўздоўжкі і ўшыркі. Дома паказваемся на месяц разы па два-тры, і, як гаворыцца, гэткія тонкія ды звонкія, што жонкі ледзьве пазнаюць.

— І не апрыкла вам, Лявонцьевіч, такое валацужнае жыццё? — ахвотна ўчэпліваюся я за гэтую размову, бо з-за розных клопатаў дагэтуль мне не ўдавалася пагаварыць з чалавекам пра яго рыбачае жыццё-быццё.

— Ці апрыкла? — у задуме перапытвае Варанец і аглядаецца на сонца.

Вялікае, зыркае, яно выкочваецца з-за ляснога ўзвалку, і возера загараецца ад яго, нібы святочнае люстра. Туман зыбаецца, дымам паўзе ў кусты, шырока і далёка — аж да белых камяніц Мядзеля — адкрываецца люстраная роўнядзь Баторына. «Калашына», як завуць яе варанянцы.

— То як можа апрыкнуць такая краса? — усміхаючыся, пытае ў сваю чаргу Мікалай Лявонцьевіч. — Га? Мы, рыбакі, з сонцам заўсягды дзень адкрываем...

— Не кожны ж дзень такі, — пярэчу. — Учора вунь як ліло, сякло ветрам...

— Яно ведама, — згаджаецца субяседнік. — Але наша работа такую сілу мае, што раз-другі паспытаўшы яе, застанешся вечным палоннікам вады і невада. І каб гэта, скажам, пазбавілі сапраўднага рыбака возера і лодкі, то ён зараз бы, як малое дзіця без маткі. Мне от скора шэсцьдзесят грукне (во-во, браток, на пенсію адправяць), і з тых год больш сарака я аддаў азёрам. Я не тое, што з бацькам, а яшчэ з дзедам рыбу лавіў. Бо тутэйшы люд у асноўным з рыбы і жыў. Зямля то ў яго была, але няўдобіца, пясок — не надта льга было разжыцца, разагнацца на ёй. А нас было ў сям'і шасцёра, і я, як самы старэйшы з братоў, вечна прападаў з бацькам на азёрах. Але і возера не заўсёды выручала кучную нашу сямейку. Каб быць тады ўдачлівым рыбаком-прамысловікам, трэба было мець добрага каня, сені, розны лавецкі рыштунак. Гэтага ў нас бракавала... Можа таму, — ціха ўсміхаецца Мікалай Лявонцьевіч, — і запомнілася мне на ўсё жыццё адна шчаслівая рыбацкая ўдача (у кожнага чалавека ўдача ў сваім дзеле бывае, адзіная і заўсягды памятная).

Раз зімой мы вылавілі з бацькам — было гэта за польскім часам — мутнікам аж пяцьдзесят пудоў рыбы. Аднаго ёршыка. Ото ж падзея была — уся Купа наша дзіўма дзівілася... Спакаваў бацька гэтае дабро ў мяхі і паехаў па вёсках прадаваць. Вярнуўся праз ноч п'яненькі, з вядром мёду і вазовішчам жыта. То досыць бульбы, браток, — спахопліваецца Мікалай Лявонцьевіч. Бярэ місу з крышанамі, засыпае іх у саган, затым адпраўляе ў вар і рыбу — цэлыя дзве місы з коптурам. Бульканне ў сагане на хвіліну-другую замірае, пара спадае...

Я падкідваю ў касцёр свежых дроўцаў, а Варанец бярэцца развязваць клуначак з рознымі спецамі.

— З часам я зачаў рыбачыць, — прыгадвае далей чалавек, — асобна ад бацькі. І ўсё, канечне, саматугам. Паны адной думкай жылі: абы паболей рыбы заграбастаць з нашых рук. Аднаго разу я быў запыліў, кінуўся з кулакамі на панскага паслугача, дык мяне потым з жонкай у вашапрудны лагер запраторылі... Тры гады прамэнчыўся там...

Пасля вайны мы, рыбакі, сышліся ў брыгады, адбудавалі рыбзавод і хадзілі на азёры ўжо ад яго. Тады ж недзе і паявіліся першыя невады, маторныя лябёдкі і лодкі, кацеры... Заработак, як і ўлоў, пайшоў густы. Так што неўзабаве я сабе новы дамок паставіў, — Варанец шчодра засыпае ў юшку спецы, намешвае ў сагане апалонікам, і сакаўная, духмяная пара кружыць мне галаву, выганяе сліну. — Ты, браток, пэўна, ведаеш, што цяпер у нас ад завода працуе шэсць рыбалоўных брыгад. Дзве тут, на Нарачы, мая і Віктара Хікеля з Чараўкоў, астатнія ў Паставах, Глыбокім, Свіры, Швакштах... Мы абслугоўваем аж 114 азёраў. Працуем круглы год, стараемся, і работа ўвесь час абнаўляецца. На помач нам прыходзяць стаўныя невады, электратралы, вугразаколы ..

Я слухаю старога рыбака і прыгадваю сустрэчу з Іванам Сямёнавічам Весніным, дырэктарам Нарачанскага рыбзавода, яго як бы мімалётныя словы, што Варанец — пераможца рэспубліканскага спаборніцтва за ўкараненне прагрэсіўных метадаў працы рыбакоў (стаўныя сеткі, вугразаколы, невады яго і на свае вочы бачыў), узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». І што такіх дбалых работнікаў-брыгадзіраў у гаспадарцы нямала. Дзякуючы ім, завод змог за восем месяцаў здаць дзяржаве 95 цэнтнераў рыбы звыш плана.

Тады ж з Іванам Сямёнавічам я прайшоўся па цэхах завода, кансервавым і цэху вэнджання, дазнаўся, што за апошнія месяцы адпраўлена сотні тысяч бляшанак рыбных кансерваў, у тым ліку і нарачанскага вугра ў жэле. Агледзеў я і будаўніцтва новага рыбзавода ля вёскі Купа, дакладней, Варанцоў, дзе жыве Мікалай Лявонцьевіч. Гэты камбінат праз год заменіць стары і цесны цяперашні заводзік. Большая вытворчая плошча, новае тэхнічнае абсталяванне дасць магчымасць прадпрыемству павялічыць выпуск прадукцыі ў чатыры разы.

...Юшка ўжо даварылася, калі варанянцы вяртаюцца з далёкіх тоняў. Рыгор Чарненка з Іванам Мурзо неяк разгублена паглядаюць на брыгадзіра, разводзяць рукамі: не пашэнціла ім на гэты раз. У лодцы варушыцца сціплая горбачка ляшчоў і сазанаў.

— І такое бывае, — ні кропелькі не дзівіцца Варанец. — Калі не адгрузіцца ад здабычы, а калі яна ў шапцы памесціцца. Рыбацкае шчасце — штука капрызлівая. Але рыбакі — народ аптымістычны: заўсягды вераць у неспадзяванак удачы. Без гэтай веры нам нельга...

Рыбакі рассаджваюцца ўкруга сагана, наразаюць хлеб, бяруць з паходнай скрынкі посуд і разліваюць пахкую, у жоўтых скалачках навару юшку. Каштую — смачна, не ад'есціся.

Паснедаўшы і прыбраўшы посуд, рыбакі пацішэлай хадой кіруюцца ў прыазёрную хату, каб адпачыць гадзіну-другую. А дзесьці папалудні яны, адданыя сыны вады, на чале з сівавалосым важаком зноў сядуць за імклівыя вёслы і пашыбуюць да новых тоняў за нялёгкім рыбацкім шчасцем.

Мядзельскі раён.

ПАРТЫЗАНСКІМІ СЦЕЖКАМІ

Хведар БАЧЫЛА

Фотакарэспандэнт газеты «Чырвоная змена» Хведар Бачыла ў гады вайны юнаком пайшоў у партызанскі атрад і разам з дарослымі змагаўся за свабоду і незалежнасць нашай краіны.

Сёння пачынаем друкаваць старонкі з яго ўспамінаў.

З ІМЕМ КАМАНДЗІРА...

Нядаўна я ўбачыў яго ў трывожным сне. Нейкі бой сярод балотаў, з усіх бакоў падступаюць карнікі, а камандзір наш, таварыш Сарока, высокі, статны, без ценю разгубленасці на твары, у самой гушчыні бою.

Я прачнуўся і ўжо да самай раніцы не мог заснуць. На памяць прыходзілі многія сустрэчы з камандзірам, пры самых розных—сумных і радасных—акалічнасцях. Гэта быў камуніст, бясстрашны, разумны камандзір народных мсціўцаў.

У атрадзе камандзіра вельмі любілі. Ён быў строгім, прынцыповым чалавекам, які не цярпеў малейшых праяў маладушнасці ў баі, недысцыплінаванасці, і быў сябрам для кожнага з нас. Заўсёды пасля бою распытае пра настрой, пра сваякоў, падзеліцца новымі планамі, адчуваеш пасля такой размовы яшчэ большую прыўзнятасць, рашучасць да апошняга біцца з ворагам. З імем Сарокі былі звязаны ўсе буйнейшыя і найбольш паспяховыя аперацыі нашага атрада. Ён быў выдатным тактыкам і мог своечасова накіраваць удар туды, дзе яго менш за ўсё чакалі акупанты.

Памятаю добра разгром нашым атрадам першага варожага гарнізона, які размясціўся ў саўгасе «Такарна». Налёт наш быў такі імклівы, што гітлераўцы і апамятацца не змаглі. Нікому з іх не ўдалося ўцячы. У нас страт не было. Мы набралі ў «Такарне» процьму зброі — кулямётаў, аўтаматаў, гранат... Калі прыцягнулі ўсё гэта ў размяшчэнне атрада. Толя Сцепічаў, выціраючы пот з твару, спытаўся ў мяне:

— Ну, як, спадабалася?

Я радасна ўздыхнуў:

— Яшчэ б. Ты ведаеш, мне здаецца, што ўсё гэта адбываецца не са мною, а нібыта глядзіш нейкі захапляючы, крыху страшнаваты фільм, або чытаеш кнігу... І гутарка ідзе не пра нас, а пра зусім іншых людзей.

— І ў мяне такое ж пачуццё. Ды і ва ўсіх, напэўна, таксама. Скажы шчыра, табе страшна было ў гэтым баі?

— Зусім не страшна,—сказаў я і не зманіў.— І ведаеш чаму? Побач жа ўсе свае, а фашысты ўцякаюць, хто куды... Я толькі па дарозе ў атрад падумаў: шалёная ж куля запраста магла ў мяне трапіць. Мароз па скуры прабег ад гэтай думкі.

— Спачатку так заўсёды бывае. Гэтак і ў людзей смелых. А ты, я бачу, не баязлівец...

Мінула некалькі дзён пасля налёту на гарнізон у «Такарне». Падыходзіць да мяне Толя Сцепічаў і, паціраючы рукі, гаворыць:

— Аперацыя ў «Такарне», калі ты хочаш ведаць—гэта дзіцячыя гульні. Ёсць цікавейшая справа. Магу сказаць табе, што будзе ў ёй удзельнічаць увесь атрад.

У гэты самы час Сарока сабраў у сябе ўсіх камандзіраў. На гэтай аператыўнай нарадзе быў распрацаваны план падрыву маста ў Самахвалавічах праз Слуцкую шашу. Шаша мела для захопнікаў велізарнае стратэгічнае значэнне. Каля шашы ўвесь час рабіліся засады, але яны не маглі надоўга паралізаваць рух на гэтай важнейшай магістралі. Трэба было ўзарваць мост. Тады б шлях для фашыстаў быў закрыты надоўга. Але зрабіць гэта было складана. Ужо вельмі старанна, як зрэнку вока, ахоўвалі гітлераўцы мост. Праз ахову камару цяжка было прасачыцца. Пра тое, каб непрыкметна прабрацца да маста і гаманкі не магло быць.

Вырашана было правесці разведку. Накіравалі групу з двух партызан нашага атрада: Мішу Заяша і Алеся Кажушку, хлопцаў адважных, рашучых. Яны потым і прапанавалі свой варыянт аперацыі—знішчыць камендатуру таксама. І прытым ударыць па двух аб'ектах адначасова. Гэта павінна выклікаць у гітлераўцаў паніку.

План Заяша і Кажушкі быў абмеркаваны камандаваннем атрада і ўхвалены.

Атрад быў падзелены на некалькі рот. Рота пад камандаваннем Віталя Пака павінна была напасці на камендатуру, а роты Пятра Сачка і Валодзі Булакава—на мост. Каб выклікаць яшчэ большую паніку сярод фашыстаў, вырашылі зрабіць выбух проста на месце. Для гэтага «падрыхтавалі» сані—паклалі ў іх з дзесятак снарадаў, прымацавалі шнур, запрэглі старога лядашчага каня...

За гэты выбух адказваў, вядома ж, Алейнікаў. Як толькі сані заедуць на мост, ён павінен тузануць за шнур. Выбух і будзе сігналам для пачатку аперацыі.

Анатоль двое сутак не адыходзіў ад сваіх саней. Перакладаў снарады, правяраў шнур.

— Узарвецца... Павінна ўзарвацца,—упэўнена гаварыў ён.

Але зноў і зноў падыходзіў да саней. Гэта было ў яго характары—усё рабіць дакладна. А тут яшчэ такая адказная справа. Калі мы рушылі ў шлях, Алейнікаў выглядаў сумным.

— Што з табою?—спытаўся я.

— Ды так, нічога страшнага,—адмахнуўся ён, а потым сказаў:—Коней я люблю з маленства. Гатовы быў днямі з сядла не вылазіць, у начное хадзіў. Шкада мне гэтага старога каня. Але без яго не абысціся. Сам жа ў сані не запражэшся...

Я трапіў у роту, якой даручана было атакаваць камендатуру. Мяне і Мішу Заяша паклікаў да сябе камандзір роты Віталь Пак.

— Як толькі адбудзецца выбух, вы знімеце вартавога. Пастарайцеся зрабіць усё чыста. Ясна?

— Ясна!—адказалі мы. І Міша Заяш, які вельмі любіў складаць планы ўсялякіх аперацый, пачаў фантазіраваць, як мы будзем знімаць вартавога.

— Ды кінь ты,—кажу яму,—мы ж вартавога яшчэ і ў вочы не бачылі, а ты ўвесь час свой генплан распрацоўваеш...

— Без плана ніводнай аперацыі не правядзеш,—пакрыўдзіўся Міша.

— Хай, добра. Пажартаваў я,—супакоіў я Мішу.

Ён засмяяўся:

— Дзіўныя ў цябе жарты. Ты папярэджвай, калі жартуеш.

І зноў пачаў бясконца гаманіць. Надта быў словаахвочы хлапец.

Мы падкраліся з ім амаль да самай камендатуры і залеглі. Цішыня навокал. Маўчым, толькі сэрца ў грудзях тахкае. Вартавы мармыча сабе нешта пад нос, ходзіць узад-уперад па ганку. Потым ён вырашыў абысці дом навокал. Мы скарысталі момант і перабеглі вуліцу. Залеглі пад самым носам у вартавога.

І вось—сігнал: выбух! Я ўскінуў аўтамат і даў чаргу па вартавому. Ён зваліўся, як сноп. З усіх бакоў панеслася:

— Ур-ра!!!

Навокал стралялі. Гітлераўцы апамятацца не маглі ад раптоўнага нападу і адбіваліся бязладна. У вокнах мільгацелі іх перапуджаныя твары. Партызаны, якія былі бліжэй да камендатуры, закідалі вокны гранатамі. Ад узрываў гранат, выстралаў ледзь не лопаліся перапонкі. Калі ўсё пакрысе супакоілася, прагучаў зычны голас Віталя Пака.

— Не страляць! Навокал—свае!

Пак жэстам паклікаў мяне. Я падбег да яго.

— Дзе Яўхім Гіра? Ён тое-сёе балакае па-нямецку. Няхай растлумачыць тым гадам з камендатуры, што да чаго. Няхай здаюцца, пакуль цэлыя.

Яўхім падняўся... Усталявалася нейкая ненатуральная цішыня. І навошта ён вытыркнуўся? Пальнуць і дапамагчы нічым не зможам.

Яўхім пачаў гаварыць па-нямецку, з цяжкасцю падбіраючы словы. У адказ—маўчанне. Вырашылі зазірнуць у будынак. Аказалася, што наш парламенцёр склікаў, здаецца, забітых—усе гітлераўцы былі знішчаны гранатамі.

Мы выйшлі на вуліцу і закурылі. Было цёмна. Недзе пракукарэкаў певень. І адкуль ён тут з'явіўся? Яўхім Гіра, цяжка дыхаючы, глыбока зацягваўся папяросай.

Нехта сказаў:

— Ну і дурань ты, Яўхім, на якое ліха вылез з-за прыкрыцця? Маглі ж фрыцы кокнуць...

Яўхім усміхнуўся.

— А я ведаў, што з гэтых гадаў паўзучых калі хто і застаўся ў жывых, дык усё роўна да зброі не дацягнецца. Моцна мы іх пакалашмацілі.

Падышоў Віталь Пак.

— Заканчвайце перакур, час за справу брацца.

— Якая яшчэ справа? — здзівіўся Яўхім. — Усё быццам бы закончылі.

— Камендатуру трэба знішчыць, навошта ім такі падарунак пакідаць.

А вось з узрывам маста адбылося не зусім так, як планавалі.

Рота Пятра Сачка, атрымаўшы сігнал да атакі, не марудзячы кінулася на штурм. Спачатку ўсё ішло, як і было задумана — немцы не вытрымалі, пачалі разбягацца. Але затым партызаны натрапілі на дротавыя перашкоды, якія прыпынілі тэмп атакі. Гэтай замінкі ворагу было дастаткова, каб апамятацца. Загаварыў іх кулямёт. Многія былі паранены, адзін партызан забіты. Сярод параненых быў і мой далёкі сваяк з Бардзілаўкі Валодзя Бачыла.

Мост пашкодзілі, ды не знішчылі, як гэта намячалася. І ўсё з-за таго, што разведка наша не выявіла драцяной агароджы. Алейнікаў быў злосны — не падыходзь. Ён ішоў і ўвесь час лаяўся:

— Ну і разведка. Каб на іх ліха! Такая справа амаль сарвалася. Камбрыг нас па галоўцы не пагладзіць.

Настрой ва ўсіх быў дрэнны. Камандзір атрада і сапраўды па галоўцы не пагладзіў, але дужа і не асуджаў.

— Зрабілі важную справу, — сказаў ён пасля аперацыі, — але падвяла толькі адна памылка,— дрэнна папрацавала разведка. Урок на будучае. Наперадзе шмат аперацый і больш складаных. Трэба памятаць, што кожная памылка каштуе жыцця.

Вось і ўсё, што ён сказаў. Тыя, хто былі ў разведцы ля маста і прагледзелі дротавыя агароджы, стаялі, апусціўшы галовы. Адзін з іх сказаў мне пасля:

— Вось бы цяпер у бой. Віну сваю хочацца загладзіць. Правільна камандзір сказаў...

Заўсёды, пры ўсялякай сітуацыі таварыш Сарока мог знайсці правільнае, патрэбнае слова, якое даходзіла да самага сэрца.

Мінулі месяцы цяжкіх партызанскіх будняў. Наш атрад паступова вырас у брыгаду.

«САЛЮТ» СВЯТУ

Набліжаўся Дзень Савецкай Арміі. У атрадзе думалі, як лепш «адсалютаваць» святу. Гарэлі жаданнем зрабіць якую-небудзь адважную аперацыю. Выпадак падвярнуўся нечакана. Мы вярталіся ў Пагужэйкі, да месца тагачаснай стаянкі атрада. У Бардзілаўцы запаслісся харчамі і рушылі далей. Праязджаючы праз Рыбцы, Пярэжыр — дашчэнту спаленыя карнікамі вёскі — адчувалі, як разгараецца ў душы прага помсты.

Да ўсіх прыйшло адно і тое ж рашэнне — вярнуцца на чыгунку, праз якую мы толькі што праязджалі. Вядома, з якой мэтай...

Толя Алейнікаў спахапіўся:

— Шнура не хопіць!

Нехта прапанаваў з'ездзіць ва Узляны. Там можна сарваць са слупоў тэлефонны провад, які добра замяняў шнур. Неўзабаве дабраліся да Узлян і пачалі зрываць провад. Работа была ў самым разгары, калі нешта прымусіла мяне ўзяць бінокль. Зірнуў у яго і аслупянеў — з боку рудзенскай дарогі едзе некалькі фурманак з гітлераўцамі.

— Камандзір, фрыцы! — крычу Алейнікаву.

А ён сядзіць сабе і гэтак ціха гаворыць, не павярнуўшыся нават у той бок, куды я паказваў рукою:

— За смерцю сваёй едуць, гады! Цяпер мы ім пакажам...

Нас было ўсяго шасцёра. На першай фурманцы ехалі Супрэнка, Валодзя Бачыла і я. Гітлераўцы мчаліся нам наперарэз.

— Заляжам каля Махоўкі, — сказаў Алейнікаў. — Падпусцім фрыцаў бліжэй. Смела біць!

Валодзя Бачыла схапіў свой кулямёт і неўзабаве быў ужо за хатай, у надзейным укрыцці. Ён заўсёды імгненна арыентаваўся і выбіраў [illegible] выгодную пазіцыю. Побач са мною [illegible] партызан па мянушцы «Сынок» з дыска[illegible] Калі яму гэтую мянушку за несамавіты [illegible]лад. У баі ж ён пераўтвараўся, і пас[illegible]выло дзіўна глядзець на яго — мале[illegible], сутулага, адным словам, «Сынка»[illegible]лася перастрэлка. Праз некалькі хвілін [illegible]а ясна, што нам з сіламі ворага цяжка спраўвіцца. Выхад адзін — адступаць. Давялося пакі-

нуць фурманкі. Я ўбачыў, як кулі ўспаролі кажух Алейнікава. Снег побач таксама быў узрыхлены кулямі. У разгары бою мы і заўважыць не паспелі, як Супрэнка стрымгалоў кінуўся ў Распуцце за надмацаваннем.

Бой то заціхаў, то разгараўся зноў. Больш цяжка даводзілася «Сынку» і Валодзю Хмялеўскаму, якія аказаліся наперадзе, адрэзаныя ад усіх астатніх. Варта было ім варухнуцца, як з боку пасёлка сыпаліся кулі. Валодзя ўсё ж змог перабегчы да нас, у лес. «Сынок» застаўся ў снезе адзін. Немцы зразумелі, што адзін з нашых адрэзаны. З пасёлка ў поўны рост пабеглі да «Сынка» чалавек пяць гітлераўцаў. Мы пальнулі па іх. Двое засталіся чарнець на снезе...

І тут падаспелі нашы. Прывёў іх Супрэнка. Не паспей ён тады — не выбрацца нам жывымі з гэтай заварушкі.

Завязаўся бой, маштабаў якога ніхто прадугледзець не мог. Гітлераўцаў набралася чалавек сто дваццаць. Узначальваў іх начальнік Рудзенскай жандармерыі.

На царкве ў немцаў быў устаноўлены кулямёт. Ён бясконца паліваў нас свінцовым дажджом. Але і кулямёт ім не дапамог. Мы ўварваліся ў вёску і пачалі расстрэльваць ворагаў ва ўпор.

Вайна дакладна вызначала пазіцыі людзей. Яны грудзьмі ўставалі на абарону Радзімы, не шкадуючы жыцця, ішлі на смерць за свабоду свайго народа, але былі і такія вылюдкі, што здраджвалі і дапамагалі акупантам. З імі абыходзіліся так, як і належала абыходзіцца з ворагамі.

Я ўбачыў, як Валодзя Бачыла, прыцэліўшыся ў паліцая, уздрыгнуў, выкрыкнуў ахрыплым голасам:

— Вацін! Гэта ты?

Паліцэйскі азірнуўся і паспрабаваў ускінуць вінтоўку, але Валодзя апярэдзіў яго — паліцэйскі, войкнуўшы, упаў на зямлю. Прабягаючы міма, Валодзя працадзіў скрозь зубы:

— Сабаку сабачая смерць!

Гітлераўцы хаваліся па дварах, усюды сустракала іх партызанская куля. Барыс Келер уступіў урукапашную з афіцэрам палявой жандармерыі і аказаўся пераможцам—немец упаў. Барыс, вяртаючыся да нас, забыўся, што не ўзяў зброі забітага. Ён папоўз назад. Па ім адкрылі агонь з укрыцця. Але ўсё ж ён не адступіў і забраў у забітага парабелум і дакументы. Гэтыя трафеі мелі для партызана і сімвалічнае значэнне як адзнака мужнасці.

У баі ворагу быў нанесены сакрушальны ўдар. Акупанты не маглі паверыць, што гэта справа рук адных партызан. Яны пісалі ў сваіх газетах, што нямецкія часці біліся з дэсантнікамі — рэгулярнымі часцямі Савецкай Арміі. Багатымі былі нашы трафеі — кулямёты, шмат вінтовак і аўтаматаў, некалькі пісталетаў.

У атрад мы вярталіся радасныя. Барыс Келер збянтэжана расказваў:

— Папоўз назад і раптам успомніў пра парабелум. І, ведаеце, браткі, не змог перад спакусай адступіць, хоця і загінуць мог недарэчна... Больш такое не паўторыцца...

Ён ганарліва круціў у руках трафейны парабелум, з дапамогай якога пазней знішчыў нямала ворагаў.

(Працяг будзе.)

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

У рэпертуары Гродзенскага абласнога тэатра з'явіўся твор В. Гюго—драма «Анджэла». Паставіў спектакль заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР А. Струнін, мастацкае афармленне—Л. Трубяцкой.

На здымку—выканаўца галоўнай ролі ў спектаклі заслужаны артыст БССР А. Цароў (Анджэла).

Барыс БЕЛІЖЭНКА

●

Сярод нас няма кагосьці...
Хто не вярнуўся, не прыйшоў...
Пасмуткаваўшы крыху, госці,
Вясёлы спеў наводзяць зноў.
А мне у гэтым шматгалоссі
Усё выразлівей чуваць:
Матуля па сынку галосіць,
Па мужу плача удава.
І сэрца вытрымаць не можа
Ад блізкіх і далёкіх страт...
А песні ўсё пра падарожжы,
Пра пах калосся, дрэў і траў...
І паляцеў бы я далёка,
І лёг бы у чужой зямлі,
Каб з-пад яе, сырой, нялёгкай,
Усталі хлопцы і прыйшлі.

СЫНУ

Каторы раз дае па мне чаргу
Мой сын з пластмасавага аўтамата,
А я ніяк загінуць не магу —
Стаю «варожым» перад ім салдатам.

— Ты падай! — Хлопчык мне крычыць тады,—
Калі страляюць — падаюць жа людзі.
Ты падай! — прынясу табе вады,
Перавяжу параненыя грудзі...

Мой хлопчык! Не хачу зваліцца з ног.
(Тым больш, калі няма сапраўднай кулі).
Памерці жартам я б ніяк не змог:
Што скажуць тыя, што навек заснулі?

Што я сказаў бы ім пасля гульні?
Такія жарты не магу апраўдваць,
Калі яшчэ ад куль і у агні
На свеце гінуць людзі па-сапраўднаму...

Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ

●

Як лісце восені, гады спадуць на плечы,
На скроні снегам ляжа сівізна.
А ты ўсё будзеш позіркам хлапечым
Глядзець як многа, многа год назад.

Ты будзеш марыць шчыра, летуценна
І зваць у далеч сінюю сваю,
Дзе я сустрэч кароткія імгненні
На ўсё жыццё ў памяці спыню.

Дзе ў кожны вечар з пройдзенага рання
Я у душы, нястомленай яшчэ,
Слоў прынясу пяшчотнае гучанне
І чысціню крыштальную вачэй.

●

Я думаю: не прыйдзе дзень апошні,
Што развітанню, пэўна, не настаць,
Што лес, яшчэ да ніткі непрамокшы,
Пакліча кветку-папараць шукаць.

Я думаю, што будзе ўсё бясконца
На вераснёўскіх сцежках, за Дняпром,
Што не саб'е ў гэтым садзе сонца
Апошні яблык восеньскім крылом.

Што будуць зоркі віснуць над кастрамі,
Спадаць на пікі вострыя ялін,
І ў гарады паедзе разам з намі
Сяброўскі, добры, шчыры ўспамін.

Раіса БАРАВІКОВА

●

Хлопчык змея запускае ў неба.
Першае дзяцінства адкрыццё!
Хлопчык, любы, можа так і трэба,
З папяровым змеем — у жыццё!
Хлопчык, любы, радасць не затойвай,
Моцна нітку у руках трымай,
Колькі хочаш, на гары прастойвай,
Колькі хочаш, змея запускай!
Запускай, няхай ўгары лунае,
Дружыць з сінявокай вышынёй...
Хлопчык сёння ў неба запускае
Светлай марай змея над сабой!

ІМГНЕННЕ

Усё адыходзіць, плыве ў нябыт.
Мне час не стрымаць, не падоўжыць імгненне.

Чырвоная іскра ляціць у блакіт,
Знікае, адчуўшы адно сутыкненне
З паветранай хваляй...
З будзённасці шэрай, нібыта з туману,
Расінкай празрыстай імкнуся да сонца,—
А раптам я промень гарачы дастану
І зоркай заззяю хаця б на імгненне,
Каб знікнуць, адчуўшы адно сутыкненне
З пяшчотай зямною!

Уладзімір МІСУН

МЯЛІ ВЯТРЫ

Мялі вятры. Панура за аўламі
Двухгорбыя ступалі вярблюды.
Пустыня мне ўяўлялася акулаю,
Калі глынала свежыя сляды.

Прарочыў дзень спякоту невыносную.
Ну, хоць бы дожджык дробненькі пацокаў.
Ды звонка раніца рыпела восямі,
Кацілася пясчанымі пярсцёнкамі,

І на зубах трашчаў пясок назойлівы.
Была арба, як ростам мы ў той час...
На рускай мове ломанай казала нам
Старэнькая «шышы»[1] штораз:

— «Казыр»[2]—твая, мая—прыедзеце...
Затым, што ўбача прад сабой, спявала,
А мы, малеча, не маглі нагледзецца,
На стэп, аўлы і на караваны.

І ўспаміналіся нам родныя палеткі
Пяшчотны шэпт бярозы і сасны...
Далёка, за спіной было Палессе,
Шугала яно ў полымі вайны.

Мялі вятры. Панура за аўламі
Двухгорбыя ступалі вярблюды...
Пра нас, сірот, казахі дбалі, думалі,
Быў бацькам кожны з іх для нас тады.

●

Урач на мускул мой
Завязвае туга павязку
І гумавы шарык ціскае.
Іртутны слупок прыбора,
Мінаючы лічбы, скача,
Праменьчыкам бліскае:
Сто...
сто восемдзесят
На дзевяноста...
«Як гэта вельмі проста»,—
Думаю я.
— Скажыце, урач, а ці можна
Змерыць зямлі нашай ціск?
Ёй жа столькі многа
Давялося вытрываць за вякі.
Якім прыборам?
Якім?
У яе ж таксама ёсць сэрца.
Падумаць толькі,
Такі цяжар трымае,
Здаецца,
Не хопіць ёй
Ртутнага слупка...

Мікола МЯТЛІЦКІ

●

Сумуе дзед, пабелены гадамі,
Па маладосці, згубленай даўно.
Нібыта ён стараецца рукамі
Адкрыць замураванае акно.

Марудзяць дні... І я парой таксама
Гатоў іх гнаць, як пугай табуны,
Забыўшыся, што зможа толькі памяць
Адкрыць акно ў свет згубленай вясны.

ХЛЕБАРОБ

Зняў шапку пасівелы хлебароб.
Зямля, што каласамі адзвінела,
Маршчыністая, як ягоны лоб,
Здалося, назаўсёды анямела.

Але рукамі ён крануў яе,
Калі вясна прыйшла у край бусліны.
І зноў яна пад ветрыкам пяе.
Ды шчэ глыбей ягоныя маршчыны.

[1] «шышы»—маці.
[2] «казыр»—зараз.

СУСТРЭЧА З ЦІКАВЫМ ЧАЛАВЕКАМ

СКАЗАННІ АБ ЛЮДЗЯХ, МОЦНЫХ ДУХАМ

Расул Гамзатаў напісаў новую кнігу — «Сказания». Паводле задумы аўтара, яна павінна ўвасобіць гераічныя старонкі далёкага і блізкага мінулага Дагестана, паказаць яго сённяшні дзень і жыццёвасць лепшых горскіх традыцый.

— Цяпер я, нарэшце, магу паведаміць, — сказаў Расул Гамзатаў у гутарцы з нарэспандэнтам ТАСС, — што жыццявілася даўняя мая мара. Яна нарадзілася ў час работы над кнігай «Мой Дагестан», калі я пераканаўся, што тэма гэтая невычарпальная. Перада мною адкрываліся ўсё новыя дзіўныя характары, лёсы. Ім я і рашыў прысвяціць асобную, паэтычную кнігу. Яна — аб людзях, моцных духам, барацьбітах за перамогу дабра і справядлівасці. І аб тым, што акалее нас — аб дамах, дрэвах, каменнях, у якіх таксама ёсць лёс, часам не менш дзіўны. Можна сказаць, што гэта — паэтычны дадатак да «Моего Дагестана».

— Вы ў свой час вярнулі да жыцця і ўзбагацілі старадаўнюю форму мініяцюр: чатырохрадкоўяў, васьмірадкоўяў, надпісаў на прадметах, потым «перасадзілі» на дагестанскую глебу санеты, а цяпер вось — сказанні, балады, якія не часта сутракаюцца ў нашы дні. Што гэта — свядомае імкненне да жанравага абнаўлення паэзіі?

— Ніколі не ставіў такой задачы. Вершы самі набываюць форму ў залежнасці ад таго, што я хачу выказаць. Кожнаму напітку — свой бакал. У новай кнізе гаворка ідзе аб рэальных падзеях, рэальных асобах — народным заступніку Хачбарэ, славутых канатаходцах з Цоўсры, пераўтваральніку прыроды Абдуле. Яны жыццём сваім стваралі эпас. Вобразы іх, натуральна, «лягалі» ў эпічны жанр. Дарэчы, сказанні, балады — спрадвечная форма дагестанскай паэзіі, яны блізкія мне па духу.

— Гатовы рукапіс лянжыць на вашым стале. Можна ў друк?

— Не, яшчэ рана. Гэта маё правіла, па праўдзе кажучы, патрэба: заварышыўшы твор, заўсёды хочацца ведаць будучых чытачоў, выслухаць думку, выказаную ў вузкім асяроддзі знаўцаў літаратуры і на сустрэчах у масавай аўдыторыі.

Сустрэчы з чытачамі Гамзатаў наогул лічыць неабходнай частнай творчасці. Нядаўна ён вярнуўся з паездкі ў Хунзах, дзе землякі слухалі яго, сабраўшыся на сельскай плошчы. Выступаў ён перад студэнтамі Махачкалы, рабочымі Буйнакска, не раз бываў у будаўніцкай Чырнейскай гідрастанцыі.

— Кантакт з аўдыторыяй дапамагае мне адчуваць пульс часу, зразумець, ці тое ты пішаш, ці не адстаў? — заўважае паэт.

Між іншым, да людзей Гамзатава цягне і ўласцівая яго натуры таварыскасць. Яго старшынскі кабінет у Саюзе пісьменнікаў адкрыты для ўсіх.

Сёлета ў паэта трайны юбілей: у верасні яму споўнілася 50 гадоў. 30 гадоў назад на прылаўках магазінаў з'явіўся першы зборнік вершаў «Пламенная любовь и жгучая ненависть». А мінулай вясною выйшла з друку ўжо 150-я кніга.

— І тым не менш, — гаворыць паэт, — думаю, што мне рана падводзіць вынік. «Уже мы не юные, ещё мы не стары». Галоўная кніга яшчэ не напісана...

Сёлета грамадскасць краіны цёпла вітала папулярнага майстра паэтычнага слова Расула Гамзатава. А ён і ў свята — працуе, працуе...

М. АМАЕЎ.

Махачкала.



Малюнкі А. Волкава да беларускай народнай казкі «Сабака і воўк», якая рыхтуецца да друку ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

НЕСПАКОЙНАЯ СПОВЕДЗЬ

У новым зборніку Валянціна Лукша ёсць невялікі верш «Пахне глеба», прысвечаны працы хлебаробаў. Паэт сцвярджае, што глеба пахне «як бохан подаву», «салёным потам», «сінімі васількамі», «спелымі каласамі», «пахне летам — добрай надзеяй земляробу дабрадзею». Заканчваецца верш сімвалічна: «Пахне хлебам зямля, якой так нялёгка даваўся спакой».

Так, сёння на нашай зямлі — мір і спакой. Аднак праз увесь зборнік «Споведзь» праходзіць адчуванне паэтам менавіта гэтай **нялёгкасці**, з якой мы дамагліся спакою і дабрабыту на нашай зямлі. І ў гэтым, мне здаецца, выткі той адкрытай публіцыстычнасці, з якой В. Лукша ў лепшых творах новай кніжкі заклікае берагчы мір і даражыць самай глыбокай радасцю, якая нам даддзена — радасцю вольнай працы. У нізцы «Станцыі майго юнацтва», у вершах «Пасляваеннае навагоддзе», «Будан», «Рулі» і іншых знаходзім пераканаўчае эмацыянальнае асэнсаванне і цяжкага, апаленага вайной дзяцінства, што выпала на лёс пакалення, да якога належыць аўтар, і непазбежных цяжкасцей першых гадоў пасляваеннага аднаўлення:

Пасляваенны час. Далёкі. Блізкі.
Прыходзіць часта з неспакойных сноў...
Ля станцыі нямыя абеліскі
Вартуюць пільна мірны сон грамоў.

(«Станцыі майго юнацтва»).

У паэзію Валянцін Лукша прыйшоў з рабочага асяродзя. Ён працаваў землеўпарадчыкам, геадэзістам, будаўнікам, камсоргам і карэспандэнтам радыё на будаўніцтве нафтагіганта ў Наваполацку. Аднак, калі ў ранейшых зборніках мы бачылі часта толькі адюстраванне тых ці іншых фактаў яго працоўнай біяграфіі, дык у новай кніжцы паэт пайшоў па шляху большага абагульнення канкрэтных з'яў і дэталей. І гэта сведчыць пра яго імкненне адысці ад дэкларацыйнасці ў вершах, паглыбіць паэтычную думку. Паэт бачыць свет вачыма чалавека, які ведае, што такое сапраўдная праца, якому давялося адчуць і смак салёнага поту, і боль мазалёў. З пункту гледжання эстэтыкі працы падыходзіць ён да ацэнкі падзей і з'яў у грамадстве. І тым, хто пагарджае гэтымі прынцыпамі, згодна паэту, нічога не застаецца, як быць эусім глухімі «да спадчыны зямлі, да паху хвоі, водару раллі, да позірку агністай палачанкі, да песні салаўя празрыстым ранкам...» (верш «Выснова»). Эстэтыка працы заклікае аўтара помніць пра пастаянную неабходнасць «пакратаць пачарнелыя далоні, узважыць, што зрабіў ты ў жыцці» («Споведзь»), дазваляе параўноўваць падучую зорку з промнікам фары ў тумане («Падучая зорка»).

Наогул, стыхія музыкі вельмі блізкая аўтару зборніка «Споведзь». У вершы «Маэстра» паўстае вобраз выдатнага збіральніка народных мелодый народнага артыста СССР Г. І. Цітовіча, «неўтаймавальнага маэстра» з яго вельмі бераклівымі і клапатлівымі адносінамі да песні. Другому выдатнаму музыканту, народнаму артысту СССР Р. Р. Шырму прысвечаны верш «Музыка».

Відаць, ад захаплення музыкай, песенняй творчасцю ўзніклі ў В. Лукшы задумы вершаў, сабраных ў раздзеле «Батлейка».

На наш погляд, крыху выпадаюць тэматычна з кнігі вершы на тэмы далёкага гістарычнага мінулага — «Пётр І у Полацку» і балада «Жывая легенда». У іх адчуваецца пэўная штучнасць, надуманасць.

Фігура Пятра І аўтарам занадта апаэтызавана: калі ён, напрыклад, выходзіць на берег Дзвіны, ля яго ног нават «усміхаліся хвалі». У баладзе «Жывая легенда» расказваецца пра тое, як аднойчы Трувар, князь варагаў, прывёў сваё войска да Лукомля-горада. Жанчыны адчынілі вароты, і ў горад-крэпасць увараліся ворагі. Яны спалілі горад.

Фабула, навеяная літаратурнымі асацыяцыямі, выглядае даволі неверагодна, бо ў фальклоры існуе своеасаблівы культ вернасці жанчыны, а не яе здрады. У фінале твора выказваецца ўпэўненасць, што тут падымецца «з прадоння вады» светлы горад. Гэта, вядома, намёк на сучасны Новалукомль, але ўнутранай сувязі з легендай тут зусім не адчуваецца.

Аўтару хочацца параць больш верыць неспакойнай споведзі свайго сэрца, бо індывідуальнасць паэта выяўляецца найбольш тады, калі ён не хавае свайго адкрытага публіцыстычнага запалу, сваіх дакладна выказаных сімпатый і антыпатый, заснаваных на веданні і нялёгкага, і радаснага ў сапраўдным жыцці.

В. НІКІФАРАЎ.

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Мікалаю ГЕРАСІМАВУ — 70

Сёння спаўняецца 70 гадоў празаіку Мікалаю Герасімаву. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Мікалай Апанасавіч! Ад усяе душы вітаем Вас, нашага таварыша і друга па пяру, з слаўным юбілеем — сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння.

Ваш літаратурны голас загучаў у трыццатыя гады і звярнуў на сябе ўвагу грамадскасці. Вы пісалі нарысы аб новым савецкім жыцці, аб шчасці вольнай працы ў роднай краіне, потым звярнуліся да жанру паэзіі. Маючы грунтоўны жыццёвы вопыт, Вы ім узбагацілі свае аповесці «Где сходятся берега», «Простуда» і раман «Узлы».

Прыемна адзначыць, што Вы закончылі ваенна-медыцынскую акадэмію імя С. М. Кірава ў Ленінградзе і пасля доўгі час служылі ўрачом у Савецкай Арміі. У пасляваенныя гады добра творча спалучалі прафесіі ўрача і літаратара. З-пад Вашага пяра з'явіліся аповесці «Огонь над Количевкой» і «Завтрашний день принадлежит тебе», якія былі цёпла сустрэты чытачамі.

Жадаем Вам, дарагі Мікалай Апанасавіч, творчага натхнення, добрага здароўя, шчасця».

□

У Магілёве на праспекце Міру стаіць у плоце груша; яснова палавіна пялёсткаў асыпаецца на асфальт, другая — на зялёны двор. Тут даўней быў дом і сад. Украіна адступіла перад новым праспектам. Дом перанеслі, ад саду засталася вось гэтая груша. Не кожны ведае, што саджаў яе пісьменнік Мікалай Апанасавіч Герасімаў, які пасля вайны перажыў з Арэнбурга ў Магілёў. Груша вырасла, і яе былому гаспадару вось ужо сем дзесяткаў...

Кожны раз мне груша нагадвае, што ў Магілёве жыве ён, Мікалай Апанасавіч, добрай душы чалавек, сціплы працаўнік. За плячыма ў яго — разнаплянавыя лні ў Петраградзе, у якім прайшло маленства і юнацтва пісьменніка, Польскі фронт грамадзянскай вайны, Ваенна-медыцынская акадэмія, доўгія гады службы ў Савецкай Арміі ў якасці ваеннага ўрача.

Нейкі час Мікалай Апанасавіч працаваў на адным з петраградскіх заводаў. Добрае знаёмства з жыццём рабочага класа вызначыла тэматыку яго першых нарысаў, апавяданняў, аповесцей. У адным рабочым літаратурным гуртку разам з ім займаўся вядомы савецкі паэт А. Пракоф'еў. Аповесці «Где сходятся берега», «Простуда» і раман «Узлы» ў трыццатых гадах былі выдадзены ў Масьве і сталі здабыткам усесаюзнага чытача. У 1955 годзе пісьменнік выдаў у Арэнбурзе аповесць аб ваенных лётчыках «Огонь над Количевкой». Праз год у выдавецтве «Молодая гвардия» выйшла аповесць «Завтрашний день принадлежит тебе». Гэта твор аб 1816 годзе на Гомельскім перасыльным пункце Заходняга фронту, аб палымяным рэвалюцыйным дзейнасці армейскіх бальшавікоў і празаранні салдацкай масы, аб адчувальным подыху рэвалюцыі.

Цяпер пісьменнік піша аповесць аб будаўніках сучаснага горада, карыстаючыся «магілёўскім» матэрыялам. У пару сваёй мудрай сталасці ён поўны творчых задум і жадання працаваць.

Аляксей ПЫСІН.

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтых віншаванняў і шчыра жадае юбіляру творчых поспехаў.

НА ПАЧАТКУ СТАГОДДЗЯ

Калі акінуць позіркам «прадукцыю» пасляваеннага беларускага літаратуразнаўства, дзе разглядаецца дакастрычніцкая літаратура, можна заўважыць такую акалічнасць. Спярша працягні час прадметам увагі даследчыкаў устойлива была літаратура XIX стагоддзя. Іменна гэты перыяд выклікаў з'яўленне найбольш значных літаратуразнаўчых прац. Затым, прыкладна ў апошнія дзесяць — пятнаццаць гадоў, літаратуразнаўчая думка скансцэнтравалася на пачатку XX стагоддзя, і вынікам зноў быў шэраг прац, розных па праблематыцы, па ахопу літаратурнага працэсу, але адзіных па сваіх даследчыцкіх мэтах — прасачыць дыялектыку літаратурнага працэсу ў Беларусі на гэтым кароткім, але выключна напружаным, складаным і цікавым адрэзку гісторыі грамадскага і культурнага развіцця беларускага народа. Прычым, у гэтых працах можна бачыць не толькі пашырэнне «геаграфіі» літаратуразнаўчых даследаванняў, але і паглыбленне ў пласты, якія раней зусім не вывучаліся.

У ліку грунтоўных і характэрных прац гэтага «другога этапу» знаходзіцца і кніга А. Лойкі «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя», якая мае на мэце прааналізаваць працэс ідэйна-творчага станаўлення беларускай паэзіі, прасачыць найбольш важныя заканамернасці і асаблівасці нашай літаратуры дадзенага перыяду.

А. Лойка не першы раз звяртаецца да літаратуры пачатку XX стагоддзя. Яго трэцяя па ліку вялікая праца аб гэтым перыядзе, як і ранейшыя, напісана тэмпераментна, зацікаўлена, шмат у чым палемічна, яна добра выяўляе такія якасці аўтара, як вострая назіральнасць, тонкае адчуванне слова, добрае веданне псіхалогіі пісьменніцкай працы, уменне зазірнуць у творчую лабараторыю пісьменніка, бачыць літаратурны працэс праз канкрэтную дзейнасць непасрэдных яго ўдзельнікаў. Уласна, асаблівасцю даследавання А. Лойкі і з'яўляецца імкненне ісці шляхам індуктыўным, г. зн. ад аналізу канкрэтных з'яў, асобных твораў, творчасці асобных пісьменнікаў да абагульнення, якія датычаць літаратурнага працэсу ў цэлым. А. Лойка з самага пачатку заўважае, што ён працяжнік застарэлых шаблонаў і схем, якія стаяць перашкодай на шляху вывучэння творчасці пісьменніка, не даюць магчымасці ўбачыць яе ва ўсім багацці і паўнаце яе мастацкага і чалавеказнаўчага зместу. І сапраўды, кніга А. Лойкі па сваёй кампазіцыі, па праблематыцы, па логіцы пошукаў і разважанняў, нарэшце, па сваёй фактуры — свежая, арыгінальная.

У кнізе дванаццаць раздзелаў, размяшчэнне якіх у паўнай паслядоўнасці вроблена не па традыцыйнай схеме. Кніга пачынаецца размовай аб творчасці Я. Купалы (раздзел «Ад сумарнасці да індывідуальнасці» пра зборнік Я. Купалы «Жалейка»). Другі раздзел кнігі таксама купалаўскі (пра зборнік «Гусляр»). Але, яшчэ не закончыўшы гаворкі пра Купалу, А. Лойка своеасабліва ў яе ўклінівае разгляд лірыкі Я. Коласа, а потым зноў вяртаецца да Купалы, каб падагуліць размову аналізам выдатнага зборніка паэта «Шляхам жыцця», які быў вышэйшым дасягненнем не толькі Я. Купалы, але і ўсёй беларускай дарэвалюцыйнай паэзіі. Далей у кнізе ідуць раздзелы пра М. Багдановіча. І ў іх, як і ў папярэдніх частках, знаходзім даволі шырокія экскурсы (асабліва ў раздзеле «Гісторыя адной легенды» аб дзейнасці М. Багдановіча-крытыка) у творчасць іншых беларускіх пісьменнікаў. Карацей кажучы, ужо ў такой арганізацыі матэрыялу можна бачыць, што аўтарам кіруе перш-наперш логіка даследавання пастаўленых праблем. Кніга А. Лойкі менш за ўсё нагадвае агляд беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя, а яе часткі — нарысы ці эсэ, прысвечаныя асобным пісьменнікам ці літаратурным з'явам. Выразна праблемны характар маюць заключныя раздзелы кнігі, у якіх разглядаецца так званая «масавая паэзія», развіццё жанру паэмы, сувязі літаратуры з фальклорам і інш.

Што датычыцца канкрэтнага зместу асобных раздзелаў, то ў кожным з іх чытач знойдзе цікавыя назіранні і вывады, якія істотна пашыраюць і паглыбляюць нашы ўяўленні аб літаратурным развіцці ў Беларусі ў пачатку XX стагоддзя.

З добрым веданнем матэрыялу гісторыі роднай літаратуры А. Лойка вядзе, напрыклад, размову пра творчасць Я. Купалы, размову канкрэтную, з шматлікімі прыкладамі, спасылкамі. І нельга не пагадзіцца з вывадамі даследчыка адносна характару дарэвалюцыйных зборнікаў Я. Купалы — «Жалейка», у якім Купала «сцвярджаў сябе паэтам мас, выразнікам іх дум і пачуццяў», а таксама «Гусляр», які, шэрагам вершаў працягваючы тэматычныя лініі «Жалейкі», вылучаўся ўвагай да лірычнага героя, духоўнае жыццё якога раскрывалася болей шырока і канкрэтна, меў выразны нахіл да філасофскай лірыкі, да пастаноўкі разнастайных агульнажыццёвых праблем.

Заслугоўвае пахвалы схільнасць аўтара кнігі даследаваць псіхалогію пісьменніцкай працы, прасочваць паэтычную эвалюцыю пісьменнікаў, развіццё ў іх творчасці пэўных ідэй, матываў. Гэта асабліва датычыцца аналізу вершаў Я. Купалы, напісаных у 1911 годзе, годзе найбольшай творчай актыўнасці паэта ў дакастрычніцкі перыяд. Зрабіўшы такі аналіз, А. Лойка паказаў, як напружана працавала думка Купалы, як маштабна мысліў паэт, якія шырокія духоўныя інтарэсы кіравалі яго пяром.

Чытаючы гэтыя раздзелы, нейк па-новаму пераживаеш і адчуваеш тое, што не раз чытаў, па-новаму бачыш Купалу-паэта. І гэта з'яўляецца несумненнай адзнакай таленавітасці крытыка, яго ўмення вельмі жыва і цікава падаць матэрыял. У кнізе нямала старонак і абзацаў, напісаных «густа», дзе знаходзім трапныя вызначэнні, характарыстыкі пісьменнікаў.

А. Лойка ўмее сцісла і разам з тым вобразна-дакладна вызначыць літаратурную з'яву, некалькімі штрыхамі намеціць партрэт пісьменніка або яго героя.

Нямала станоўчага ў адрас даследчыка можна было б сказаць, аналізуючы раздзелы пра М. Багдановіча, якія займаюць добрую трэць кнігі, калі не болей, але думаем, што ў гэтым няма патрэбы: крытыка ўжо выказала адносіны да выкладзеных у іх думак раней, калі выйшла асобным выданнем кніга А. Лойкі «Максім Багдановіч» (1966).

Аднак у сувязі з вырашэннем праблемы «Месца М. Багдановіча ў працэсе станаўлення дакастрычніцкай беларускай літаратуры» ў працы А. Лойкі патрэбна не толькі гаварыць аб станоўчых якасцях кнігі, але аб пэўных яе супярэчнасцях. А супярэчнасць заключаецца ў тым, што карціна развіцця беларускай паэзіі ў пачатку XX стагоддзя намаляована, на наш погляд, некалькі «не прапарцыянальна». Вельмі кідаецца ў вочы такая акалічнасць, што над усім даміную М. Багдановіч. І гэта выяўляецца не толькі ў чыста аб'ёмным плане, але, і тут галоўнае, у схільнасці даследчыка разглядаць з'явы беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя пераважна «праз прызму» багдановічаўскай праблематыкі, асабліва ў апошніх раздзелах кнігі.

Мы, чытачы А. Лойкі — даследчыка літаратуры, якія ўважліва сочаць за яго працай, добра разумеем, адкуль гэта ідзе і чым тлумачыцца, ведаем, якое месца ў яго даследаваннях займае М. Багдановіч. Засяроджанасць на творчасці М. Багдановіча, захопленасць ёй, уласна, мелі адносіны і да з'яўлення гэтай кнігі, якая ўзнікла на аснове даследаўчага матэрыялу, што мела назву «Максім Багдановіч і беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя». А. Лойка шмат у чым перапрацаваў апошняе, дапоўніў, пашырыў раздзелы, прысвечаныя Я. Купалу і Я. Коласу. Аднак у выніку такой перапрацоўкі «дэфармацыі» матэрыялу, натуральныя ў праблемным даследаванні, не былі зусім ліквідаваны. І калі чытаеш кнігу пад такой шырокай, абагульняючай назвай «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя», моцна адчуваеш яе спецыфічнасць, не вытлумачаную ні загалоўкам, ні падзагалоўкам. Прычым прыгадваецца гэта спецыфічнасць не столькі як рэшткі непераадоленай своеасаблівасці папярэдняга даследавання (для чытачоў, якія не ведалі пра яго існаванне, яно іначай і не можа ўспрыняцца), а як вугал гледжання даследчыка на літаратурны працэс, як аўтарская схільнасць бачыць М. Багдановіча ледзь не ў самым цэнтры літаратурнага руху ў Беларусі ў пачатку XX стагоддзя.

У кнізе А. Лойкі сапраўды добра пацвярджаецца вядомы парадокс аб тым, што вартасці даследавання могуць перарастаць у яго недахопы. Тое, што паслужыла перадумовай арыгінальнасці кнігі, падказала аўтару новы ракурс размовы пра беларускую літаратуру пачатку XX стагоддзя, стала ў канчатковым варыянце кнігі, як кніга аб «асноўных заканамернасцях і асаблівасцях» літаратурнага развіцця ў Беларусі на пэўным этапе, пэўнай перашкодай для шырокіх абагульненняў.

Вельмі добра, што А. Лойка зазірнуў у тую сферу літаратурнай гісторыі, куды доўга не заглядвалі нашы літаратуразнаўцы (бо гэта не на паверхні, бо гэта патрабуе добрай падрыхтаванасці даследчыка ў галіне псіхалогіі літаратурнай творчасці, у галіне паэтыкі), але мабыць правільна будзе адзначыць: выбраная ім пазіцыя для размовы аб **асноўных, агульных** заканамернасцях літаратурнага працэсу наўрад ці з'яўляецца найзручнейшай. Бо праз М. Багдановіча ўсё ж разглядзець Я. Купалу і Я. Коласа ва ўсім багацці ідэйна-мастацкага зместу іх паэзіі наўрад ці можна. Не выпадкова і атрымалася так, што ідэйна-мастацкая эвалюцыя Я. Купалы, напрыклад, у кнізе паказана пераважна толькі па дзвюх лініях: а) у плане паглыблення індывідуальнага пачатку і ўсё большай скансцэнтраванасці паэта на раскрыцці свайго «я» і б) узмацнення рамантычнага струменю паэзіі Я. Купалы. І тое, і другое правільна, аднак гэтага, на наш погляд, недастаткова для характарыстыкі росту Я. Купалы як паэта, паэта глыбока сацыяльнага. Кніга А. Лойкі, думаецца, выйграла б, калі б у ёй цыграй былі дадзены сацыялагічныя абгрунтаванні тых змен, якія адбываліся ў творчасці Я. Купалы і іншых пісьменнікаў, калі б аўтар не лічыў, што ў гэтым кірунку ўжо ўсё або амаль усё высветлена папярэднімі працамі беларускага літаратуразнаўства, якое, гаворыць А. Лойка, «на жаль, завельмі доўга затрымалася на высвятленні сацыяльна-палітычных эквівалентаў ідэйна-мастацкага зместу творчасці пісьменнікаў».

Ёсць усё ж нешта недакладнае ў такім падагульняючым (у заключэнні кнігі) выказванні А. Лойкі: «Прытрымліваючыся дэмакратычнага прынцыпу — быць зразумелымі народу, лепшыя прадстаўнікі беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя зрабілі ўсё для таго, каб вывіць сябе як сялянскіх песняроў. Яны, вядома, з самага пачатку ўзвышаліся над масай, былі будзіцелямі яе сацыяльна-палітычнай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці. Аднак у сілу эстэтычных прынцыпаў рэалізму і народнасці стваралі творы, дзе як бы раствараліся ў масе, былі проста выразнікамі яе дум і настрояў. Выразіўшы такім чынам жыццё народа, пераважна селяніна-працаўніка, Купала і Колас сталі раскрывацца затым непасрэдна самі — як таленавітыя прадстаўнікі свайго народа, як канцэнтраванае выражэнне народнага светаўспрымання, асаблівасцей нацыянальнага характару».

Вельмі непрывычна гучыць гэта «раздзяленне функцый» на розных этапах творчасці паэтаў, асабліва Я. Купалы, які іменна ў той, сталы перыяд, у 1915 годзе, г. зн. пасля выхаду «Шляхам жыцця», у вершы «Бацькаўшчына» сказаў крылатыя словы: «роднай нівы я мільённая часціна», тым самым як бы падкрэсліўшы думку, што ён жыве і расце разам з народам. Іншымі словамі, мы ўсё ж схільны да таго, **каб гэты, правільна заўважаны даследчыкам, працэс паглыблення індывідуальнага пачатку ў паэзіі Купалы тлумачыць зменамі, што адбываліся ў жыцці народа.** Звярнуўшыся да шырокага выяўлення духоўнага жыцця асобы ў сваёй паэзіі, Купала тым самым паглыбляў і тэму народнага жыцця. Такая эвалюцыя паэта ў канчатковым выніку была ўсё ж абумоўлена глыбінным працэсамі, што адбываліся ў грамадскім жыцці, тлумачыліся паступовым, няхай сабе яшчэ не масавым працэсам самавызначэння асобы ў народзе ў выніку развіцця рэвалюцыйных падзей, развіцця рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Беларусі. І такая эвалюцыя выяўлялася, дарэчы, не толькі ў лірычных вершах, але і ў ліра-эпічных творах («Курган», «Бандароўна», «Магіла льва» і іншых), дзе герой — прадстаўнік народа ў самым даклад ным сэнсе гэтага слова адначасова з'яўляюцца і яркімі асабістасцямі, індывідуалізаванымі характарамі.

Ды і калі ўзяць з прывядзенага выказвання А. Лойкі вызначэнне ролі паэтаў як будзіцеляў народа, то цяжка сказаць, на якім этапе Купала, напрыклад, быў болей актыўным і даёйсным будзіцелем народа, у часы зборніка «Шляхам жыцця», калі ён паглыбляўся ва ўнутраны свет асобы ці ў часы «Жалейкі», калі ён страваў «сумарны вобраз мужыка». Гэта патрэба даследаваць абавязкова ў непасрэдной сувязі з канкрэтна-гістарычнымі абставінамі.

Дарэчы, адносна тэрміна «сумарны вобраз мужыка», які ў апошнія часы ў літаратуразнаўстве знаходзіць пашырэнне. Думаецца, што яго наўрад ці можна прызнаць удалым, асабліва, калі ён ужываецца некаторымі крытыкамі безадносна да канкрэтных асаблівасцей гістарычнага развіцця, разумеецца, як асаблівасць нейкага ніжэйшага этапу развіцця паэзіі і толькі. У навуцы ёсць іншае, на наш погляд, болей дакладнае паняцце для абазначэння таго, што ўкладваецца ў эмест «сумарнага вобраза». Гэта — «сацыяльны тып». Перавага ж сацыяльнай тыпізацыі над мастацкай індывідуалізацыяй зусім не абавязкова з'яўляецца сведчаннем ніжэйшага этапу развіцця паэзіі. У паэзіі гэта вельмі часта аднака не **публіцыстычнасці.** І «сумарнасць» вобраза беларускага мужыка ў Купалы ў перыяд «Жалейкі» — ёсць, акрамя таго, не што іншае, як адзнака яе адкрытай публіцыстычнасці, абумоўленай характарам часу, падзеямі рэвалюцыі 1905 года. Спасылкай на публіцыстычнасць паэзіі Купалы і Коласа мы, праўда, зусім не збіраемся тлумачыць усе перыпетыі іх творчай эвалюцыі, але перакананы, што гэты ідэйна-жанравы аспект неабходна ўлічваць пры размове аб іх творчасці.

У кнізе А. Лойкі ёсць і іншыя моманты, якія выклікаюць жаданне паспрачацца з аўтарам. Мы не будзем на іх спыняцца, не толькі па той прычыне, што вельмі абмежаваны плошчай газетнай рэцэнзіі, але і таму, што не лічым гэта недахопам кнігі. Хутчэй наадварот. У А. Лойкі свой погляд на рэчы і выражаны ён ярка. Кніга яго прымушае думаць, мысліць.

Не абыдземся хіба толькі без таго, каб не сказаць аб даследчыцкай манеры А. Лойкі, манеры своеасаблівай. У рэцэнзуемай літаратуразнаўчай працы вельмі адчуваецца А. Лойка-паэт. У гэтым яго перавага над іншымі, болей, як кажуць, сухімі, «сумнымі», акадэмічнымі літаратуразнаўцамі. А. Лойка вельмі востра бачыць адценні, жывыя і вобразна дакладна іх характарызуе, лёгка пранікае ў падтэкст твора, у яго ўнутраную сутнасць. Ён сваёй размовай адразу заражае чытача. Але такой манеры звычайна спадарожнічае і некаторая «эскізнасць» размовы, часам не абавязковая, на наш погляд, эмацыянальнасць, лірычнасць, што вядзе да вельмі суб'ектыўнага ўспрымання, да перабольшвання станоўчых асаблівасцей асобных твораў. Для прыкладу спашлемся на аналіз верша М. Багдановіча «Упалі з грудзей пана бога», верша ўвогуле цікавага, але не такога, які б можна ацэньваць як нейкую вяху ў беларускай паэзіі.

М. ЛАЗАРУК.

А. А. Лойка. «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя. Некаторыя заканамернасці і асаблівасці». Мінск, выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1972.

ДЫЯПАЗОН ТВОРЧАЙ СТАЛАСЦІ

На экранах рэспублікі дэманструецца новая мастацкая кінастужка студыі «Беларусьфільм» «Аблокі» (сцэнарый Б. Лабкова, аператар В. Нікалаеў). Яна прысвечана нашым сучаснікам, тым, хто ўступае ў самастойнае жыццё, хто імкнецца здзейсніць сваю першую запаветную мару.

Паставіў карціну рэжысёр Барыс Сцяпанаў, выпускнік Усесаюзнага Дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі (творчая майстэрня Рыгора Аляксандрава).

БАРЫС СЦЯПАНАЎ... Цяпер ён ужо належыць да ліку сяродзіны пакалення беларускіх кінематаграфістаў. А, здаецца, зусім нядаўна рэжысёр радаваўся першаму самастойнаму, хоць і кароткаметражнаму фільму «Сакратар укома» (1961) з кіналальманаха пад агульнай назвай «Апавяданні аб юнацтве». Герої стужкі — юнакі і дзяўчаты — камсамольцы незабыўных дваццатых гадоў...

Навела маладога пастаноўшчыка аказалася найбольш цласнай і ўдалай. А сам ён зарэкамендаваў сябе таленавітым мастаком, пра якіх гавораць звычайна: «падае надзеі». Перад ім адкрылася шырокая дарога ў «вялікае кіно». З таго часу яго цікавіць мужны, духоўна ўстойлівы чалавек, які б мог служыць прыкладам, узорам для ўсіх — у паводзінах, жыцці, барацьбе за шчасце.

Вострымі сюжэтамі, драматычнымі сітуацыямі, моцнымі характарамі прываблівалі яго апавяданне В. Труніна, аповесць В. Быкава, сцэнарыі М. Садковіча, Р. Шмырова. Па іх рэжысёрам былі ў розныя часы пастаўлены мастацкія фільмы «Апошні хлеб», «Альпійская балада», «Я, Францыск Скарына», «Бацька». Пра кожны гаварылася ў друку і ўсе адзначаліся на Усесаюзных фестывалях. «Альпійская балада» да таго яшчэ была прызнана лепшай карцінай на кінафоруме ў Дэлі.

Звяртаеш увагу на тое, што гэты кінематаграфіст разглядае характары герояў у самыя кульмінацыйныя моманты іх жыцця, учынкаў, рашаючых выпрабаванняў. Персанажы яго фільмаў прызнаюць толькі вышэйшыя чалавечыя каштоўнасці. Па іншых законах яны існаваць не жадаюць і не хочуць. Не можа кінуць дзяўчыну ў альпійскіх гарах беларускі хлопец Іван Цярэшка. Не могуць жудасныя кастры інквізіцыі запалохаць вялікага вучонага Францыска Скарыну. Не асабістыя, а грамадскія інтарэсы ставіць на першы план савецкі патрыёт, партыйзанскі важак Бацька Мінай, калі вырашаецца лёс яго Радзімы.

Фільмам Б. Сцяпанава забяспечвае поспех умение рэжысёра спалучаць усе выяўленчыя магчымасці мастацкага кіно і, вядома, высокая прафесійная культура ў рабоце з выканаўцамі ролей. Ён працаваў з многімі артыстамі. Выбар быў бездакорным. Прыгадаем: Любоў Румянцава (Джулія ў «Альпійскай баладзе») на запальным фестывалі рэспублік Прыбалтыкі, Беларусі і Малдавіі атрымала прэмію за лепшую жаночую ролю; Юрый Гарабец удастоены дыплома за лепшую мужчынскую ролю на V Усесаюзным кінафестывалі ў Тбілісі.

Высокім мастацкім узроўнем вызначаюцца работы Станіслава Любшына — партнёра Л. Румянцавай па фільму «Альпійская балада»; Барыса Уладамірскага ў ролі паплечніка Бацькі ў фільме «Бацька», Алега Янкоўскага — стваральніка на экране вобраза Скарыны; Льва Дурава — Леаніда ў «Аблоках».

Дарэчы, пра «Аблокі» — апошнюю карціну Барыса Сцяпанава. Як цідвяджаюць кінематаграфісты, **даследаванне сучаснага жыцця** — самая складаная задача. Здараецца і так, калі нават вопытныя, «масцітыя» майстры экрана не могуць «адолець» яе.

Б. Сцяпанаў выбраў героя, які толькі пачынае шукаць сваё месца ў жыцці, шукаць сваю прафесію. А яна павінна быць «крылатай», бо ён задумаў стаць лётчыкам.

...Коля (Я. Герасімаў) жыве на Палессі, у невялікім раённым гарадку. Скончыў дзесяцігодку. Мог застацца тут — работу выбірай любую. Не! Толькі лятаць. Інакшага рашэння быць не можа.

І суправаджае ён кожны дзень самалёты, як птушак у вырай. Прагна глядзіць ім услед, моцна зайздросціць тым, хто сядзіць за штурвалам. Да болю сціскаецца сэрца ад жадання самому ўзняцца ў вышыню. А на шляху да мэты многа перашкод. Самая галоўная з іх — медыцынская камісія, якая дала заключэнне, што ў Колі слабы вестыбюлярны апарат...

Аднак Коля не здаецца. Уладкоўваецца ў авіямайстэрню рабочым, каб мець хоць якое дачыненне да самалётаў, бачыць іх. Яго, напрыклад, здзіўляюць развазжанні аднаго «кіношніка», што, маўляў, ім «крылы непатрэбны». Ім — значыць кіназдымачнай групе, бо адслужыўшы сваё, старэнькі самалёт будзе выкарыстаны ў якасці ветрадуя... на здымачнай пляцоўцы. А Коля, наадварот, не ўяўляе свайго жыцця без крылаў. Бо ў гэтым ён бачыць радасці жыцця, будучыні. Кароткі па метражы эпізод насычаны глыбокай думкай, сімволікай.

Планы і пачуцці Колі яшчэ больш зразумелыя ў супастаўленні з Леанідам (Л. Дураў). Гэты намнога старэйшы чалавек, амаль равеснік маці юнака, шмат чаго пабачыў на сваім вяку, прызвычаіўся да жыцця, якое рухаецца нібы плынь ракі... Ён заўсёды прыйдзе на дапамогу іншым. Калі трэба, можа ахвяраваць сваім дабрабытам, сваім пачасцем. Леанід жыў бы інакш, калі б можна было пачаць усё зноў... Але цяпер яму застацца адно — дапамагаць свайму малодшаму сябру і разам з ім падзяляць радасць удачы. Паміж імі ўзнікае моцная, мужчынская дружба. Мы бачым фрагменты з мастацкага фільма «Два байцы». Б. Сцяпанаў уключыў іх у сваю стужку невыпадкова: яны сімвалізуюць сувязь нашых сучаснікаў з пакаленнем Вялікай Айчыннай... Тады, у жорсткай барацьбе з ворагам, гартаваліся савецкія людзі, мацнела іх дружба. Нашым сучасникам ніколі не трэба забываць пра гэта — заклікае фільм Б. Сцяпанава.

У карціне «Аблокі» нібы суіснуюць дзве інтанацыі — паэтычная і бытавая. Простаму, звычайнаму рэжысёр імкнецца надаць нейкую рамантычную афарбоўку. Аблокі — неба — зямля — як дыстанцыя. Пераадолець яе могуць толькі людзі мужнага складу. І стваральнікі стужкі праводзяць менавіта такую думку.

У мяккай, лірычнай манеры зняты В. Нікалаевым многія кадры. Вось, напрыклад, з самалёта, які толькі што зрабіў пасадку, выходзяць пілоты. Размінаюцца пасля падарожжа. Зялёнае трава наўкол, мноства кветак. Эпізод набывае паэтычнае адценне. Мы глядзім на ўсё, што адбываецца, вачыма летуценніка Колі. Так, летуценніка, бо да мэты яму яшчэ вельмі і вельмі далёка...

Вобраз галоўнага героя магла б узмацніць «дзейнасць» іншых персанажаў. Тыя ж Сцяпан (Ю. Смірноў), які не разумее свайго пасынка, хоць і стараецца, как дома, у сям'і ўсё было добра; або маці (І. Савіна), што знаходзіцца нібы паміж «двух агняў»; а таксама равесніку яе сына Міцька (Я. Мянынноў), прыгажуня Люська (М. Саломіна) з яе першым ў жыцці расчараваннямі.

Часам не зусім разумееш, дзеля чаго існуюць тыя ці іншыя персанажы і нават эпізоды, якую нясуць яны драматургічную нагрузку. Прыгадаем хоць бы эпізод у класе, калі галоўны герой Коля проста здзекуецца над сваім старым настаўнікам...

А свавольны палёт на самалёце? Да чаго заклікае гэты ўчынак Колі? Ёсць у фільме і іншыя дэталі, эпізоды, якія загрувашчваюць дзею, не маюць непасрэднага дачынення да аўтарскай задумы. Глядзіш фільм і адчуваеш, быццам едзеш на аўтамабілі па рытвінах: рывок — прыпынак, рывок — прыпынак. Зноў разгон і зноў тармажэнне. Шэраг мантажных урэзак, якія ідуць рэфрэнам і якіх, відаць, павінны былі ўзмацніць усю тую ж паэтычную танальнасць (паказвае камера аблокі ці буслоў у палёце), не спрыяюць цэласнасці кінатвора.

Пры ўсіх гэтых і іншых недахопах заслугоўвае ўвагі творчы пошук Б. Сцяпанава ў распрацоўцы сучаснай тэматыкі, пошук новых кантактаў, новага супрацоўніцтва з пісьменнікамі і прафесійнымі кінадраматургамі. Сцяпанаў не возьмецца за пастаноўку карціны, калі не ўбачыць, уласным сэрцам не адчуе і не пераканаецца ў тым, што на гэтым матэрыяле можна зрабіць хвалюючы твор.

Майстэрства рэжысёра ў тым і праяўляецца, у якой ступені ўдаецца яму дасягнуць адзінства выяўленчых сродкаў кінематографа. Зразумела, пры наяўнасці сцэнарыя з акрэсленай аўтарскай пазіцыяй, глыбока выпісанымі характарамі і поўнымі грамадскімі праблемамі.

Хай сабе не ўсё ўдалося ў «Аблоках». Але тое, што вядомы беларускі кінематаграфіст звярнуўся праз некалькі гадоў да сучаснай тэмы, заслугоўвае адабрэння.

А. БАРАЗНА.

«ГАЛОЎНАЯ ЎДАЧА» —

ТАК НАЗЫВАЕЦЦА НОВАЯ ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ СТУЖКА БЕЛАРУСКАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭЛЕБАЧАННЯ. ФІЛЬМ ПРЫСВЕЧАНЫ ПЕРШАПРАХОДЦАМ, ШУКАЛЬНІКАМ БЕЛАРУСКАЙ НАФТЫ НА ПАЛЕССІ.

Вось што сказаў пра сваіх герояў аўтар сцэнарыя Васіль Якавенка:

Аляксандр ШУБІЧ — буравы майстар. Па характару просты, шчыры і сціплы хлопец. Гатовы змагацца хоць усё жыццё, абы толькі адваяваць багацце зямлі — нафту.

Іосіф РУТКОЎСКІ — Герой Сацыялістычнай Працы, таксама буравы майстар. Як і А. Шубіч, рабіў першыя кроні ў пошуках нафты, разам з ім радаваўся працоўным поспехам...

Уладзімір УШАКОЎ — спецыяліст па даследаванню нафтавых газаў у гліністы растворы (прамывачнай вадкасці), рацыяналізатар да «мозгу касцей», чалавек з адкрытым сэрцам, настойлівы.

Рыгор КАЛДАШЭНКА — інжынер, геолаг. Спецыяліст навагарэнкага склаву. Энергічны, ініцыятыўны...

Валянцін ЗАЦІЦАЎ — буравы майстар, таксама з ліку ветэранаў.

...Усіх гэтых людзей аб'ядналася адна прафесія, адзін клопат. Іх дзейнасць — яскравы прыклад працоўнай самаахвярнасці. А галоўная заслуга ў тым, што ў Прыпяцкай упадзіне яны знайшлі нафту...

Геолагам па прафесіі з'яўляецца і сам аўтар сцэнарыя. Ці трэба здзіўляцца, што ён ведае матэрыял і не менш дасканала валодае ім. Яго пяру належыць некалькі нарысаў, прысвечаных шукальнікам нафты.

Мы задалі некалькі пытанняў В. Якавенку.

Якую мэту ставіў перад сабой творчы калектыў, калі пачынаў работу над фільмам? Улічваючы, што пра беларускіх нафтавікоў яшчэ раней ствараліся кінастужкі — «Глыбокі гарызонт», «Нафта Беларусі», «Нафта і нафтахімія», што новага дае гледачу тэлевізійны нарыс «Галоўная ўдача»?

— Тэлефільм адносна невялікі, — адзнаў сцэнарыст, — але работы над ім было шмат. Зразумела, хваляванняў таксама. Хацелася паказаць гледачу працу беларускіх нафтаразведчыкаў сёння, у сучасных абставінах. Паказаць не проста нафтавікоў, а энтузіястаў пошуку, паватараў «вытворчасці». Канцэпцыя завалася тэма так: будні энтузіястаў... Аднак, сюды мімаволі «далучаліся» і іншыя тэмы. Напрыклад, дружба, інтэрнацыяналізм у працы савецкіх людзей. Помню, прынёс я сцэнарый. Хваліваўся. Але мне спадабалася, што рэдактары «Тэлефільма» Міхаіл Клебановіч і Валерыя Арнаўтаў вельмі сустрэлі мяне, як новага аўтара, і ўважліва разгледзелі сцэнарый. Не з лёгкіх была задача рэжысёра У. Унукава і аператара А. Міцюлі. Ад іх патрабавалася даць не ілюстрацыі да падзей, а раскрыць чалавека ў працоўным пошуку...

Што датычыць ацэнкі нашага фільма «Галоўная ўдача», то не мы, а глядач яму суддзя.

І першыя гледачы сапраўды сказалі ўжо некалькі шчырых слоў пра новую работу беларускіх тэлежурналістаў.

Леанід ВАЛЧКОЎ, сталяр:

— Фільм усхваляваў мяне тым, што па-чалавечы проста і праўдзіва расказвае пра геолагаў. Яны — на пярэднім працоўным рубяжы, крок за крокам адваёўваюць у прыроды вялікае багацце — нашу беларускую нафту. Аляксандр Шубіч, Іосіф Руткоўскі, Валянцін Зяцяў, Уладзімір Ушакоў... Імёны такіх творчых шукальнікаў у працы ўвойдуць у гісторыю рэспублікі, як імёны сканом, салігорскіх шахцёраў, будаўнікоў аўтамабільнага. Наваполацкага нафтаперагоннага заводаў і нашага, трактарнага, таксама...

Рыгор СТРУНЕУСКІ, мантажнік:

— Калі глядзіш «Галоўную ўдачу», то думаеш — які цуд можа зрабіць наш чалавек!..

Уладзімір ПАЛЯШЧУК, чыгуначнік:

— Амаль кожны дзень у розных напрамках рэспублікі праводжу я магутныя саставы цыстэрнаў. Пачатак гэтаму нясыпнаму патоку паклалі геолагі. З іх пошукаў пачыналася нафта. Пра гэта цёпла, шчыра, задушэўна і па-дзелавому расказвае тэлевізійны фільм «Галоўная ўдача».

Аляксандр ЧАРКАШЫН, служачы:

— Бываючы ў службовых камандзіроўках, сустракаю людзей розных прафесій, у тым ліку і геолагаў. Яніх як гэта нястомныя працаўніки! Дожджы, снег, мяцеліца — для іх не перашкода. Кожны гатовы прайсці ўсе цяжнасці, каб толькі выканаць заданне. Здзіўляе іх апантанасць, упэўненасць. Стужка кароткая па метражы. Будзем спадзявацца, што кінематаграфісты яшчэ не раз звернуцца да гэтай тэмы.

А. «спружына» ўнутранага сюжэта ў гэтым творы, згодна з асаблівасцямі дакументальнага кіно, «раскручваецца» рознымі сродкамі.

Дыктарскі тэкст нясе не толькі інфармацыйную, але і глыбока сэнсавую, нават драматургічную функцыю («Кожная свідравіна, як разведка боем...», «Чатыры тысячы метраў прасвідравалі, і ні нафты, ні вады...» «Дваццаць адзін год па лясах і балотах за ёю ўдагонкі...», «Многія, страціўшы надзею, пакідалі экспедыцыю...», «Другія працягвалі пошукі...», «Скупаватая зямля, ды людзі ўпартыя...»).

...На адной свідравальні ўскладніліся справы. Ёй трэба тэрмінова дапамагчы. Гэтае пытанне абмяркоўваецца на агульным сходзе калектыву. Эпізод зняты сінхронна.

Сінхронным эпізодам у фільме належыць значная роля. З цікавасцю слухаеш, напрыклад, успаміны ветэранаў працы, першаадкрывальляў рэчыцкай нафты, расказы спецыялістаў і кіраўнікоў. З дыктарскага тэксту і ад іх, выступаючых, даведваешся, што за восем папярэдніх гадоў здабылі 21 мільён тон нафты і столькі ж намечана здабыць за тры гады, а да канца пяцігоддзя колькасць узятага ў глыбінях Палесся «чорнага золата» складзе 50 мільёнаў тон! Пераканаўчыя лічбы!

Што датычыць выяўленчага раду, то ён таксама пакідае добрае ўражанне. Аператар Аркадзь Міцюля паклапаціўся аб тым, каб найбольш поўна, ярка, эмацыянальна расказаць гледачу пра геолагаў і іх справы. Знятыя ім вышкі, тэхніка, нібы ўпісваецца ў пейзаж старажытнай палескай зямлі, падкрэсліваючы значэнне гераічнага працоўнага подзвігу савецкага чалавека.

Праўда, трэба адзначыць, што тэхнікі ў фільме задужа, што асобныя кадры выглядаюць або статычнымі, або камернымі — аператар будзе кампазіцыю так, нібы байца выйсці за поўныя рамкі, выйсці на вялікую прастору... І яшчэ такая заўвага. Аўтары «Галоўнай удачы» настолькі захапляюцца часам спецыфічнымі аспектамі прафесіі геалагічных разведчыкаў, што месцамі фільм успрымаецца амаль як вучэбна-метадычная інструкцыя.

Але здымачная група і дэбютант у кінапубліцыстыцы В. Якавенка ў галоўным бяруць правільны напрамак адлюстравання важнай тэмы сучаснасці і захапляюць гледачоў.

Алесь МАЦКЕВІЧ.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Беларускі дзяржаўны драматычны тэатр імя Я. Коласа паказаў прэм'еру — спектакль «Гісторыя граху» паводле аднайменнага рамана Стэфана Жаромскага (інсцэнізаўка Т. Абакумоўскай і Б. Луцэнкі). Паставіў спектакль рэжысёр Б. Луцэнка, мастак — А. Салаўёў, музычнае афармленне Б. Насоўскага.

На здымку, зробленым для «ЛіМа» С. Коханам, — сцэна з «Гісторыі граху». У ролях графа Плаза-Сплаўскага, Евы Пабратынскай і Похранга заслужаны работнік культуры БССР Я. Буракоў, артыстка В. Бяззубава і артыст Л. Трушко.

МХАТ у 75

Народны артыст БССР Цімох СЯРГЕЙЧЫК:

ШКОЛА ВЫСОКА ПРАЎДЗІВАГА МАСТАЦТВА, УНІВЕРСІТЭТ САПРАЎДНАГА МАЙСТЭРСТВА, ВОПЫТ ГЛЫБОКАГА АСЭНСАВАННЯ ЖЫЦЦЯ — ВОСЬ ШТО ТАКОЕ МХАТ ДЛЯ НАС, ДЗЕЯЧОЎ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ СЦЭНЫ.

ВЕТРАЗІ НА РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ВЕТРЫ

РОЎНА семдзесят пяць гадоў назад, у кастрычніку 1898 года, адкрылася заслона новага рускага тэатра, які прадоўжыў і развіў перадавыя традыцыі рэалістычнага мастацтва, заснаваныя на глыбокім разуменні грамадскіх запатрабаванняў часу. Яго рэпертуар з імёнамі А. Чэхава і М. Горкага на афішы, сацыяльна-праўдзівае раскрыццё рэчаіснасці і дасканалая абмалёўка чалавечых характараў абазначылі знамянальны этап у гісторыі сусветнага тэатра наогул.

Мастацкі тэатр вельмі высока цаніў Уладзімір Ільіч Ленін. Надзвычай заняты партыйнай і дзяржаўнай работай, ён знаходзіў час, каб наведваць спектаклі гэтага калектыву. Ленін, не раз гаварыў, што выходзіць пасля спектакля бадзёрым, з новым прылівам сіл і жаданнем працаваць...

Цяпер чатыры літары, што азначаюць скарочаную назву гэтага тэатра — МХАТ — ведае ўвесь свет.

У гады Савецкай улады, а на іх прыпадае б о л ь ш ы п е р ы я д творчай дзейнасці тэатра, мастацтва мхатаўцаў, дзякуючы развіццю і ўзбагачэнню закладзеных К. Станіслаўскім і Вл. Немяровічам-Данчанкам прынцыпаў, узнялося на вышэйшую ступень. Варта прыгадаць, што яшчэ ў 1928 годзе ў газеце «Правда» з нагоды 30-гадовага юбілею МХАТа выступіў А. Луначарскі і, вызначаючы арыенціры развіцця тэатра калектыву, падкрэсліў, што ў спектаклі «Браняпоезд 14—69» па п'есе Ус. Іванава адчувалася не толькі сіла і пераканальнасць рэалізму, мастацкая завершанасць і шчырасць у раскрыцці пачуццяў, а і патэнцыяльны гераічны сімвалізм і рэвалюцыйная рамантыка. Выснова артыкула была такая: «Сапраўдны пралетарскі глядач добра разумее, што цяпер гэта яго тэатр, што поспехі тэатра — яго поспехі...» Лепшыя работы МХАТа абуджалі і абуджаюць актыўныя эмоцыі і грамадскі роздум аб жыцці, волю да дзейнасці і рэвалюцыйнага пераўтварэння рэчаіснасці. Мхатаўцы славяць Чалавека з вялікай літары. Шэраг спектакляў і сцэнічных вобразаў, створаных на гэтай сцэне, набылі значэнне савецкай класікі — такая ясная ў іх партыйная пазіцыя мастака, народнасць і выразнасць у тэатральным увасабленні.

Напярэдадні юбілейнай даты — 75-годдзя МХАТа — карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» звярнуўся да народнага артыста БССР Цімоха Сяргейчыка з просьбай расказаць пра даўнія і такія плённыя сувязі сцэнічнага мастацтва Беларусі з гэтым вядучым тэатрам Краіны Саветаў. Вось што ён сказаў:

— Пачну з таго, што ў мяне і маіх аднагодкаў па былому Другому БДТ (цяпер тэатр імя Якуба Коласа) з МХАТам звязаны самыя запаветныя і вельмі асабістыя перажыванні. Аматары сцэнічнага мастацтва ведаюць, што ўрад маладой Савецкай Беларусі на пачатку 20-х гадоў скіраваў у Маскву групу моладзі з рабочых і сялян на вучобу. Сярод гэтых, апантаных марай стаць артыстамі, былі Аляксандр Ільінскі, Мікалай Міцкевіч, Кастусь Саннікаў, Любоў Мазалеўская, Стэфанія Станюта, Раіса Кашэльнікава, Алена, Радзялоўская, Алена Лагоўская, Лідзія Шынко, Вольга Барысевіч, Павел Малчанаў, Марыя Бялінская, Яніна Глебаўская, Сцяпан Скільскі і Зінові Вялікі. Мы прыехалі ў Маскву і адразу атрымалі такія яркія і незабыўныя ўражанні, што яны сталі пэўным, вобразна кажучы, «падмуркам» нашай далейшай творчай дзейнасці наогул. І самы вялікі ўплыў на станаўленне нашых густаў і мастакоўскіх перакананняў зрабіў, зразумела, МХАТ...

Тое, што паказвалі на сцэне мхатаўцы, кранала да слёз. Не думайце, што я перабольшваю: такая асалода і такі эстэтычны эфект, што адчуваеш душэўны ўздым: Хацелася і самому зрабіцца, можа, і не такім акцёрам, як яны, але хоць трошкі падобным да іх.

Таму першай вартасцю, якую мы зведалі тады, можна назваць такую — мхатаўцы сваёй творчасцю і паводзінамі давалі нам узор прафесійнага майстэрства і грамадзянскай адказнасці. Гэта ж вельмі важна на пачатку творчага шляху — правільна выбраць прыклад для сябе! Успрымаючы непасрэдна ігру вялікіх майстроў рускай сцэны, студыйцы засвойвалі лепшыя традыцыі і далучаліся да творчых шуканняў. Станіслаўскі... Масквін... Качалаў... Кіпер-Чэхава... ... Леанідаў... Што ні вобраз, то мастацкае адкрыццё! І мы потым у сціплых пакойчыках, дзе знайшла прытулак Беларуская дзяржаўная студыя тэатральнага мастацтва, падоўгу абмяркоўвалі пабачанае на сцэне, нават «паказвалі» адзін аднаму, які жэст зрабіў Масквін або Міхаіл Чэхаў, хто і як «трымаў» паўзу, з якой інтанацыяй вымаўляў кароткую рэпліку. Бы галоўныя ўрокі, зразумела, мы атрымлівалі ад нашых настаўнікаў. А яны былі мхатаўцамі, і нашы сустрэчы з імі часта адбываліся пасля таго, як ім самім на рэпетыцыях або на занятках давялося літаральна сёння паслухаць выказванні Станіслаўскага аб рабоце акцёра над сабой і над роляй.

Вучэбнымі класамі былі пакоі і фае сціплага кінатэатра «Арс» на Арбаце. Акурат там мы, будучыя акцёры Другога БДТ, упершыню пачулі словы — «сістэма Станіслаўскага». Выкладаў яе артыст Другога МХАТа В. А. Громаў. Ён пазнаёміў нас з асноўным прынцыпам рэфарматара сцэны — Станіслаўскі на той час распрацоўваў тэорыю, метад і тэхніку мастацтва сцэны, што памагаюць ёй вызваліцца ад дылетантызму з яго штампамі і трафарэтамі, з надзеяй на «натхненне» і рамесніцкія навыкі. Такім чынам, пасля таго, як перад намі паўстаў узор акцёра-майстра, мы глыбей зразумелі і тое, што так эмінае праўдзе ў мастацтве — дылетантызм (многія з нас тады ўпершыню пачулі такі тэрмін). С в я д о м ы м удзельнікам творчага акта і выканаўцам ролі ў спектаклі ты можаш быць тады, калі разумееш, што ідэя ў сцэнічным творы раскрываецца праз учынкі герояў, знітаваныя скразной дзеяй і падначаленыя звышзадачы, галоўнай мэце, дзеля якой пішацца п'еса, ставіцца на сцэне, іграюцца ролі. Адсутнасць такой выразнай і зразумелай ідэйнай мэты МХАТ лічыў катастрофай.

Калі артыстычная дзейнасць — гэта не толькі «служба», а прызванне чалавека, то ён, кіруючыся сістэмай Станіслаўскага, створыць такі сцэнічны вобраз, які засведчыць і вызвіць асобу мастака і грамадзяніна. Нашы настаўнікі далучалі нас і да артыстычнай этыкі, прынцыпы якой фарміраваліся і распрацоўваліся на навуковым грунце дзеячаў МХАТа.

Там, у студыі, мы адчулі, што навуковая сістэма ў творчасці не мае нічога агульнага з амярцвелымі правіламі. Нашы настаўнікі не нівеліравалі акцёрскія індывідуальнасці, а ўсяляк спрыялі росквіту кожнай індывідуальнасці. Мастацкі кіраўнік студыі В. С. Смышляеў, нашы педагогі Б. М. Афонін, А. А. Гейрот, С. В. Гіяцынтава і іншыя названы мной Громаў так наладзілі вучэбны працэс, што ўжо на самым пачатку мы адчулі сябе калектывам. І гэта адчуванне таксама вельмі «мхатаўскае»: калі кожны адказвае за агульны поспех, не грэбуе маленькай роляй, удзелам у масоўках, не ставіць сябе вышэй за іншых («прэм'ерства» — хвароба ў тэатры небяспечная), жыве духам агульнай справы і практычна ўносіць свой уклад у яе.

Яшчэ калі мы вучыліся ў Маскве, даведаліся, што і Першы БДТ захапляецца перадавымі мхатаўскімі метадамі працы. Асабліва адчувальныя вынікі дало супрацоўніцтва яго артыстаў і рэжысёраў з адным з паплечнікаў Станіслаўскага яшчэ па Таварыству мастацтва і літаратуры, з аўтарам першай манаграфіі - даследавання пра выдатнага наватара — з Мікалаем Аляксандравічам Паповым.

Наогул, трэба адзначыць, што беларуская сцэна вельмі хутка паказала, які плён дае школа МХАТа, ніколькі не змяншаючы і не скажаючы выразнага нацыянальнага аблічча трупы. Вопыт непасрэднай садружнасці беларускіх артыстаў з мхатаўскімі рэжысёрамі толькі пацвярджае гэта — у розныя гады ў нас ставілі спектаклі Іосіф Раеўскі, Барыс Мардвінаў, Ілья Судакоў, Аляксей Дзікі, Павел Златагораў... Дарэчы, звярніце ўвагу на тое, што кожнае з гэтых імёнаў мы сустракаем побач з імёнамі Станіслаўскага і Немяровіча-Данчанкі і, бывае, на афішах з назвамі этапных для савецкага тэатра работ наогул.

Старэйшае пакаленне артыстаў перадае вахту творчай моладзі. Абнаўляецца і сам МХАТ. Ды тое, што было прадыктавана часам і створана семдзесят пяць гадоў назад у Маскве, — тэатр, які адкрыта паставіў побач са словам «Мастацкі» слова «Агульнадаступны», жыве і радуе новыя пакаленні гледачоў.

Усе мы з глыбокай пашанай успамінаем, як дакладна і прадбачліва акрэсліў Уладзімір Ільіч Ленін адносіны да мастацтва сцэны, сказаўшы народнаму камісару асветы Луначарскаму: «Калі ёсць тэатр, які мы павінны з мінулага ў што 5 ні было выратаваць і захаваць, — гэта, вядома, Мастацкі тэатр...».



А. Глебаў у сваёй майстэрні (1955 г.).

МАСТАК ПЛАСТЫЧНЫХ ВОБРАЗАЎ

Адкрылася выстаўка беларускага скульптара Аляксея Канстанцінавіча Глебава — выдатнага мастака пластычных вобразаў і вядомага педагога. Мінула пяць год, як абарвалася жыццё гэтага чалавека, улюбёнага ў мастацтва і сваіх герояў. Но адно пакаленне маладых мастакоў, у тым ліку і скульптараў, будзе вывучаць пакінутую ім багатую спадчыну; галерэю рэалістычных партрэтаў вядомых гістарычных дзеячоў, пісьменнікаў і артыстаў, мастакоў, рабочых, калгаснікаў і людзей іншых прафесій.

А. ГЛЕБАЎ. Элегія.

Беларускія мастакі ведаюць А. Глебава і як выдатнага майстра шматфігурных барэльефаў, манументальных скульптурных помнікаў, многія з іх, на жаль, засталіся не завершанымі.

Перш чым пачаць расказ аб выстаўцы Аляксея Канстанцінавіча Глебава, якая нядаўна адкрылася ў Мастацкім музеі БССР, спынюся ля помніка-абеліска ў Мінску. Зноў мой позірк затрымаўся на барэльефе А. Глебава «Партызаны Беларусі», створаным па гарачых кроках вайны, удзельнікам якой быў сам аўтар...

Калі ўваходзіш у Мастацкі музей БССР, прыцягвае ўвагу вялікі фотаздымак работы А. Глебава «Сустрэча У. І. Леніна на Фінляндскім вакзале ў красавіку 1917 г.».

Скульптару ўдалося пераканаўча перадаць тыя незабыўныя хвалюючыя падзеі. Ваенныя атрыбуты, фігуры рэвалюцыйных матросаў, салдат-чырвонагвардзейцаў і рэвалюцыянераў, як быццам бы зліліся ў адзінае цэлае. І разам з усімі — правадыр. Такая ідэя гэтага хвалюючага твора. На выстаўцы народнага мастака БССР экспануюцца дзесяткі вялікіх і малых закончаных твораў і эцюдаў да іх, скульптурныя партрэты праслаўленых людзей «М. І. Калінін» (1953 г.), «Леў Даватар» (1955 г.). «Янка Купала» (1960 г.) і «Першая конная» (1966 г.).

Доўгія гады працаваў Аляксей Канстанцінавіч і над помнікам, прысвечаным выдатнаму сыну Беларусі Францыску (Георгію) Скарыне. На жаль, заўчасная смерць не дазволіла яму завяршыць гэты помнік. Нягледзячы на гэта, помнік хутка будзе ўстаноўлены ў Полацку. Задуму скульптара прадоўжылі яго былыя вучні — скульптары Ігар Глебаў і Андрэй Заспіцкі.

У літаратурным музеі імя Янкі Купалы экспануецца двухфігурная кампазіцыя «Янка Купала і Максім Горкі». На каленях Янкі Купалы раскрыты сшытак з вершамі.

У гэтай кампазіцыі ярка паказаны характары двух вялікіх людзей, іх узаемаразуменне, любоў.

Аляксей Канстанцінавіч шмат увагі аддаваў вывучэнню пластыкі жаночай фігуры. Пошук пластыкі быў накіраваны скульптарам на раскрыццё абагульняючага вобраза нашай сучасніцы, які знайшоў увасабленне ў скульптурнай кампазіцыі «Юнацтва» (1963 г.).

Гэтая кампазіцыя выканана ў дрэве. Памер яе больш натуральнай велічыні. Перад намі — маладая стройная прыгожая дзяўчына з адухоўленым тварам, поўная ўнутранай дынамікі.

На выстаўцы А. Глебава экспануюцца розныя па задуме і тэматыцы кампазіцыі, такія, напрыклад, як: «Плаўчыха», «Гімнастка», «Купальшчыца», «Грабцы», іх вобразы леглі ў аснову пры стварэнні значных твораў, такіх, як «Юнацтва» і «Плаўчыха» (1963 г.).

А. К. Глебаў вядомы і як партрэтыст-рэаліст. Прадстаўленыя на выстаўцы партрэты «М. І. Калінін» (1959 г.), «Народны артыст СССР Ул. Уладамірскі» (1949 г.), «Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Ул. М. Кудрэвіч» (1950 г.), «А. М. Горкі» (1947 г.). Партрэты «Артыстка Валчкова» (1959 г.), «Стары калгаснік» (1957 г.), «Герой Савецкага Саюза Леў Даватар» (1955 г.), «Герой Савецкага Саюза Я. Фамін» (1961 г.), выкананы на высокім прафесійна-мастацкім узроўні ў традыцыях рускай рэалістычнай школы.

Дзмітрый МАСЛАЎ.

А. ГЛЕБАЎ. Георгій Скарына (адзін з варыянтаў кампазіцыі. 1954 г.).

А. ГЛЕБАЎ. Гімнастка з абручом.

ЖЫВЫ МЕТАЛ

У КОЖНАГА мастака ёсць свае планы і задумы. І ён пастаянна выношвае сюжэты і тэмы, якія ўдасканальвае, дэталізуе, змяняе. Але ў выніку ўсе назіранні мастака, яго перажыванні, няўлоўныя ўнутраныя рухі душы, найскладанейшыя перапляцені яго светаўспрымання, характар, памножаныя на майстэрства, нябачна прыводзяць да нараджэння новага твора...

Хто ён? Каваль, зваршчык, хімік? У яго цеснай майстэрні і зварачны апарат, і грувасткія ціскі, набор малаткоў, чаканаў, цюбікі з фарбамі, нацягнутае палатно...

На мой погляд, Уладзімір Паўлавіч Рамейка і каваль, і зваршчык, і хімік. Але перш за ўсё ён мастак.

...На рабочым стале — незакончаны чаканны барэльеф Уладзіміра Ільіча Леніна...

...Паступова ажывае метал... З ювелірнай дакладнасцю — ніводнага выпадковага руху — працуе рука майстра і ўжо яскрава выступаюць дарагія сэрцу абрысы.

На высокай белай сцяне адчаканены партрэт юнага Адама Міцкевіча. У прытушаных светлавых танах металу тонка перададзены дух эпохі, у якую тварыў паэт.

У творчай майстэрні іх двое — муж і жонка Рамейкі.

Надзея Гаўрылаўна закончыла Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне графікі.

Яе карціны, замалёўкі з натуры вабяць душэўнасцю, лірычным настроем, багаццем светлаценяў, лёгкасцю. Яны пахнуць блакітнымі вятрамі дарог, цяплом жытнёвых каласоў. Многія работы, выкананыя пастэллю і акварэллю, пераведзены Надзеяй Гаўрылаўнай у гравюру.

Яе нястомная праца, яе задумы перапляліся з працай і задумамі мужа Уладзіміра Паўлавіча.

Уладзімір Паўлавіч шмат ездзіць па рэспубліцы. Ад паездак у Салігорск, на Полацкі нафтабуд, аўтазавод, Мінскі трактарны нарадзіліся яго «Ліцейны цэх», «Кавалі», «Стрэлачнікі»...

Мастак пластычна, выразна перадаў рытм сучаснага жыцця, і ў гэтым свая музыка, непаўторнасць рэпартажнай хвіліны. Колер насычаны, дынаміка закладзена дзесьці ўсярэдзіне, у другім пласце фарбаў.

Серыя вайны: «Смерць таварыша», «Абеліск», «Раніца», «Вясна 45-га», (...бег аднекуль хлопчык і раптам спыніўся ўражаны — на ўзгорку застыў падбіты нямецкі «тыгр». На твары — разгуб-

ТАБЕ, ПЯЦІ-ГОДКА!

Беларускія мастакі — частыя госці на Лукомльскай ДРЭС. Іх захапляе героіка стваральнай працы будаўнікоў і энергетыкаў, веліч індустрыяльнага пейзажу. Свае замалёўкі з буйнейшай будоўлі рэспублікі і прапануе чытачам мастак Іосіф Капялян.





ПОШУК КАДРА

ФІЛЬМ пачынаецца з літаратурнай першаасновы. Калі сцэнарый гатовы — за яго бярэціца рэжысёр, які стварае рэжысёрскую распрацоўку будучай стужкі. Адначасова працуе і мастак. Тое, што рэжысёр і аператар пакуль што толькі ўяўляюць сабе, мастак «паказвае» на паперы, стварае серыю эскізаў, якія вызначаюць месца дзеяння, «падказваюць» рэжысёру напрамак пошуку. Нават калі рэжысёр не прымае тое, што прапануе мастак — усё роўна, дапамога рэальная, бо рэжысёр ведае, што па гэтаму шляху ісці не трэба.

Для мяне асабіста праца над эскізамі — адзін з важнейшых этапаў у рабоце. У эскізе я не імкнуся дакладна напісаць усе дэталі будучай дэкарацыі, таму што ў працэсе работы, як правіла, прыходзяць усё новыя і новыя ідэі, больш цікавыя, больш дасканалыя. Усё другараднае, наноснае не павінна перашкаджаць. Гэты працэс працягваецца і тады, калі ў павільёне студыі ўжо зроблена дэкарацыя. Бывае і так, што ў эскізе нешта атрымалася, а ў павільёне не глядзіцца. І наадварот. Таму для мяне галоўнае ў эскізе не інтэр'ер або экстэр'ер, а вобраз, агульны настрой.

Карацей кажучы, эскізы павінны даваць шырокае поле дзейнасці для рэжысёра, падказваць светлавое рашэнне аператару, а артыстам лепш зразумець характары сваіх герояў.

Другім важным момантам у рабоце над фільмам, здаецца мне, выбар натуры. Ад дакладнага выбару натуры для здымкаў залежыць поспех той або іншай сцэны. Напрыклад, пры выбары натуры для апошняга фільма «Антыквары» мы праехалі амаль па ўсёй Прыбалтыцы і спыніліся толькі на Рызе, горадзе, які больш за іншыя адпавядаў сцэнарна-пастановачным патрабаванням.

Пасля таго, як эскізы напісаны, натура выбрана, пачынаецца работа па ажыццяўленню сваёй задумы. У гэты час мастак робіць эскізы будучых дэкарацый, сочыць, як выконваюцца заказы, дапамагае рабочым, што будуюць дэкарацыі. А калі дэкарацыі гатовы, удзельнічае ў іх «засваенні» аператарам.

У час здымак мастак павінен быць гатовы да ўсякіх нечаканасцей, таму што вытворчасць фільма нязменна ставіць яго ў самыя складаныя абставіны. Ён заўсёды павінен умець знайсці найбольш яркую і цікавую трактоўку выяўленчага вобраза.

Мастак кіно — стваральнік вобраза і адначасова інтэрпрэтатар чужой думкі. Ён павінен умець пераконваць у праваце сваёй задумы і ў любы час ахвяраваць ёй у імя інтарэсаў фільма, адстойваць сваю трактоўку, не падаўляючы творчую ініцыятыву таварышаў. Напэўна, яшчэ доўга можна было б пералічваць кола абавязкаў мастака кіно. Мне ж хочацца прапанаваць на суд чытачоў «ЛІМа» некалькі сваіх эцюдаў, зробленых да фільма «Антыквары» (сцэнарый і пастаноўка Сяргея Нілава, аператар Таццяна Логінава), які неўзабаве з'явіцца на экранах.

А. ЦІХАНОВІЧ.





Эскізы да фільма «Антыквары».

ленасць і радасць. Вось-вось хлопчык сарвецца з месца і, адчайна падкінуўшы ў самае неба шапку, закрычыць: «Ура!»).

Серыя заканчваецца «Мантажнікамі». Тут на другім плане замерла на момант будаўніцтва, а юнакі проста ад кранаў, ад напаленага сонцам металу прыйшлі на рабочую пляцоўку перакусіць. Яны спяшаюцца, ім няма калі... Юнацтва прадаўжае справу, загінуўшых на дарогах вайны, бацькоў. Дзесьці тут, сярод іх хлопчык, які падкідваў у неба вушанку.

Самі вобразы акрылены ўнутранай чароўнасцю, пачуццямі, якія бываюць толькі ў хвіліны найвялікшага пад'ёму душы мастака.

Мы сядзім у яго ў майстэрні і гутарым пра жывапіс, пра яго таварышаў.

Інстытут даў яму добрую школу малюнка. У незабыўнага прафесара Валянціна Віктаравіча Волкава сярод галоўных патрабаванняў былі аналіз і свядомыя адносіны да натуры.

Віталь Канстанцінавіч Цвірко вучыў уменню перадаць збіральны вобраз, свабоду думкі, настрой.

Пэндзаль і чакан! Узяўшы ў рукі чакан, ці не здрадзіў ён пэндзлю?

— Мастак павінен валодаць усімі відамі мастацкага пісьма, і, галоўнае, быць патрабавальным да сябе,— гаворыць Рамейка.

Так, ён лічыць, што чаканка — вельмі складаны від мастацтва. Хаця б таму, што няўдалы мазок пэндзлем можна выправіць, няўдалы ўдар чаканам загубіць усю задуму.

— І хоць мастацтва чаканкі сваімі карэннямі ідзе ў глыбіню вякоў, але для нас яно новае, да многага прыходзіцца даходзіць самому. Вывучыўшы агульныя законы выяўленчага мастацтва, вядома, маеш прафесійную арыентацыю мастака, а вось фізічныя магчымасці металу даводзіцца пазнаваць у працэсе работы.

Я бачу, як яго вочы напаўняюцца болем, калі ён гаворыць аб нізкапробных падробках пад народную творчасць.

Так, мастак і павінен быць менавіта такім: чулым да людзей, да народнай творчасці, быць патрабавальным да сябе, увасабляючы шматграннае жыццё ў метале, які перад умелай рукой майстра ажывае.

З. ДАБРЫНЕЎСКІ.

СЯБРУЮЦЬ МУЗА З НІВАЙ

З УСІХ брыгад па-святочнаму апранутыя людзі спяшаліся ў прасторны дом культуры калгаса імя Леніна Талачынскага раёна. Да іх прыехалі жаданыя госці — артысты Дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Сёння яны пакажуць на калгаснай сцэне спектакль «Таблетку пад язык» па п'есе А. Макаёнка.

Паміж коласаўцамі і хлебаробамі калгаса імя Леніна — даўняя дружба. Амаль усе спектаклі, якія падрыхтаваў тэатр, ставіліся тут, у калгасным доме культуры. Так, паляводы, жывёлаводы, механізатары гэтай гаспадаркі мелі магчымасць прагледзець спектаклі па п'есах «Шостае ліпеня» М. Шатрова, «Трыбунал» А. Макаёнка, «Амністыя» М. Матукоўскага і іншыя. З цікавасцю слухалі сельскія гледачы расказ народнага артыста БССР Ф. Шмакава аб яго працы над вечна жывым вобразам У. І. Леніна ў спектаклі «Шостае ліпеня», а таксама творчыя справаздачы народных артыстаў рэспублікі А. Шэлега і З. Капапелькі, заслужанага артыста БССР Г. Дубава і іншых.

Коласаўцы задаволены тым, што хлебаробы шчыра ўспрымаюць іх творчасць. Артысты старэйшага беларускага тэатра пабывалі са спектаклямі ў дзесятках калгасаў і саўгасаў Віцебшчыны.

Сёлета шэфская дзейнасць работнікаў культуры і мастацтва рэспублікі значна ўзрасла і пашырылася.

Вялікі ўклад у справу ідэйна - мастацкага выхавання працаўнікоў сельскай гаспадаркі Брэстчыны ўносіць Брэсцкі драматычны тэатр імя Ленінскага камсамола Беларусі, калектыў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», абласны краязнаўчы музей. З 1 ліпеня 1972 года па 1 жніўня 1973 года, напрыклад, брэсцкі тэатр паказаў на вёсцы 247 спектакляў, на якіх пабывала 90 тысяч гледачоў. Калгаснікі і рабочыя саўгасаў бачылі лепшыя пастаноўкі тэатра. Гэта — «Мяшчане» М. Горкага, «На бойкім месцы» А. Астроўскага, «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, «Трыбунал» і «Зацюканы апостал» А. Макаёнка, «Не трывожся, мама!» Н. Думбадзе, «Толькі адно жыццё» А. Маўзона, «Самы шчаслівы чалавек» А. Пінчука і іншыя.

У час падрыхтоўкі да 50-годдзя ўтварэння СССР тэатр праводзіў семінары культасветработнікаў, на якіх ішла размова пра тое, як лепш падрыхтаваць святочныя канцэрты, падабраць цікавы матэрыял для выступлення. На семінарах сваімі думкамі падзяліліся галоўны рэжысёр тэатра народны артыст БССР Г. Волкаў, заслужаны артыст БССР С. Еўдашэнка, і іншыя. Пры тэатры цяпер працуе кансультацыйны савет, які сістэматычна аказвае практычную дапамогу сельскай самадзейнасці.

Упраўленне культуры аблвыканкома сумесна з тэатрам замацавалі рэжысёраў, артыстаў і мастакоў за народнымі тэатрамі і сельскімі самадзейнымі калектывамі. Тут праводзіцца стажыроўка кіраўнікоў самадзейнасці, яны прысутнічаюць на рэпетыцыях, вывучаюць на практыцы майстэрства рэжысёра, акцёра, мастака і іх удзел у стварэнні спектакля.

Значна палепшыў шэфскую работу Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. У апошні час ён паказаў 40 выязных спектакляў у калгасах і саўгасах. Праведзены спецыяльныя двухтыднёвыя гастролі па Любанскаму, Старадарожскаму і Маладзечанскаму раёнах. Хвалюючай і радаснай была сустрэча купалаўцаў у Вязынцы, на радзіме вялікага народнага песняра Янкі Купалы, дзе тэатр паказваў сваю любімую «Паўлінку».

На спектаклях, пастаўленых тэатрам у вёсках рэспублікі, пабывала больш за 40 тысяч гледачоў. У выязных пастаноўках прымалі ўдзел выдатныя майстры сцэны — народныя артысты СССР Л. Рахленка, П. Малчанаў, З. Стома, народныя артысты БССР С. Бірыла, Р. Кашэльнікава, В. Пола, М. Бялінская, Г. Макарава, З. Браварская і іншыя. З хлебам і соллю сустракалі калгасныя гледачы артыстаў.

Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача імя 50-годдзя ЛКСМБ свае гастролі ў гэтым годзе прысвяціў працаўнікам палёў Мінскай і Віцебскай абласцей, было паказана 144 спектаклі.

Часта выязджае да хлебаробаў Гродзенскі абласны драматычны тэатр. У сёлетнім сезоне яго спектаклі прагледзела звыш 80 тысяч сельскіх жыхароў.

Шчырую дружбу ўстанавілі з хлебаробамі калектывы Гродзенскай музычнай школы, абласнога Дома народнай творчасці і бібліятэкі імя Карскага.

Шырацца сувязі культурных устаноў з вёскай на Магілёўшчыне. Абласны драматычны тэатр, напрыклад, шэфствуе над калектывамі Бялыніцкага раёна. 9 гарадскіх дамоў культуры маюць свае «спадарожнікі» ў калгасах. Бібліятэкі абласнога цэнтра перадалі сельскім бібліятэкам 1500 тамоў кніг.

Заслужанай павагай і папулярнасцю ў сельскіх гледачоў вобласці карыстаецца Магілёўскі агіттэатр «Усмешка», а таксама агітбрыгада Быхаўскага раённага дома культуры « У дарозе». Яны заўсёды жаданыя госці хлебаробаў.

З усёй адказнасцю працуюць калектывы Гомельскага драматычнага тэатра, Бабруйскага тэатра драмы і камедыі, Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Дзейсную творчую дапамогу народным тэатрам і сельскім драматычным калектывам у працы над новымі спектаклямі аказвае Беларускае тэатральнае аб'яднанне. Саюз мастакоў БССР арганізоўвае ў раёнах і сельскіх дамах культуры перасоўныя мастацкія выстаўкі.

Высакародную справу робяць нашы ўстановы культуры, дзеячы мастацтва і літаратуры на вёсцы. Сёння прыемна адзначыць, што за шэфскія сувязі з калгасамі і саўгасамі некаторыя тэатры, творчыя саюзы, палацы культуры, бібліятэкі адзначаны вымпеламі, дыпломамі, граматамі ВЦСПС, Міністэрства культуры СССР, Белсаўпрофа і Міністэрства культуры БССР.

Гэтыя ўзнагароды радуюць і абавязваюць. Трэба, каб шэфская работа над вёскай была планавай, паўсядзённай. Неабходна павысіць ідэйна-мастацкую якасць спектакляў і канцэртаў, з якімі тэатры і творчыя калектывы выступаюць у сельскіх клубах.

І тут варта сказаць, што некаторыя творчыя арганізацыі забывалі пра свае падшэфныя калгасы і саўгасы, калектывы сельскай самадзейнасці.

Працаўнікі нівы чакаюць ад дзеячоў мастацтва хвалюючых сустрэч, цікавых твораў аб жыцці савецкіх людзей, аб дружбе народаў, аб будаўніцтве светлага камуністычнага грамадства.

Ул. СТЭЛЬМАХ,
старшыня рэспубліканскай камісіі па культурна-шэфскай рабоце на вёсцы, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

ГАЛОЎЧЫЦКІЯ ДУДАРЫ

ФЁДАРА Адольфавіча Маліноўскага мы дома не засталі.

— Узяў некалькі чарацінак і пайшоў у клуб. Казаў, што з райцэнтра хтосьці завітаў да яго дудкі слухаць. На днях у Гомель выступаць з дачкой і зяцем паедзе. Хоць самой у артысткі падавайся, — так жартаўліва сказала нам пра сваіх музыкантаў жонка Фёдара Адольфавіча Любоў Мікалаеўна.

Яна ж дадала, што ігрой на дудзе муж захапляўся з маленства. Але ўсур'ёз гэтай справай пачаў займацца пасля таго, калі ў 1967 годзе пабываў у Мінску на рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці. Там народны артыст СССР Р. Р.



На здымку—(справа налева) Фёдар Адольфавіч Маліноўскі, яго дачка Валянціна і зяць Аляксандр у час выступлення.
Фота В. ЮХНО.

Шырма параіў здольнаму выканаўцу стварыць ансамбль дудароў.

І пачаліся пошукі. Працуючы ў Галоўчыцкай сярэдняй школе настаўнікам, Фёдар Адольфавіч здолеў прыцягнуць да ўдзелу ў сваім «чарацінным» аркестры многіх вясковых хлапчукоў і дзяўчынак. Неўзабаве прыйшлі першыя поспехі. Дударам апладзіравалі хлебаробы свайго і суседніх калгасаў, а таксама жыхары вёсак Палескага і Народзіцкага раёнаў Украіны, з якімі мяжуе Нараўлянскі раён. Галоўчыцкія дудкі-чарацінкі пяшчотна спявалі на раённых і абласных аглядах мастацкай самадзейнасці. Аб поспехах гэтага музычнага калектыву сведчаць шматлікія дыпломы і граматы, заваяваныя на творчых спаборніцтвах...

Праўда, удзельнікі аркестра, скончыўшы школу, разляцеліся хто куды, але калектыў не распаўся. І хоць ён зараз не такі шматлікі, ды ўсё роўна дорыць людзям радасць. Сёння яго галоўныя выканаўцы — гэта сам Фёдар Адольфавіч, яго дачка Валянціна, зяць — мастацкі кіраўнік мясцовага дома культуры Аляксандр Дорман, некалькі вучняў з Галоўчыцкай сярэдняй школы.

З хаты, дзе жыве настаўнік, мы прыйшлі ў Галоўчыцкі дом культуры. Рэпетыцыя яшчэ не пачыналася. Прычыну затрымкі растлумачыў дырэктар дома культуры Іван Ярашэнка:

— Фёдар Адольфавіч рыхтуе «свежы» інструмент. Чарот — матэрыял даволі крохкі. Таму перад адказнымі выступленнямі Маліноўскі яго заўсёды абнаўляе.

У пакоі для рэпетыцый быў той вясёлы гоман, які ўласцівы вясковай самадзейнасці. Удзельнікі ансамбля пад баян настройвалі свае далікатныя інструменты. Некалькі юнакоў, шчыльна абступіўшы настаўніка, назіралі за нараджэннем чарговай дудачкі. Вось ён узяў залаціста-карычневую чарацінку, і, асцярожна, вострым, як брытва, сцізорыкам, пачаў яе абрабляць. Праз мінуту-другую інструмент быў гатоў. Прайшло яшчэ некалькі часу і азёрныя чарацінкі ва ўмелых руках самадзейных музык зайгралі, заспявалі віхурную «Лявоніху», потым вясёлы «Крыжачок», мілагучную «Перапёлачку»... Дзівосныя мелодыі нагадвалі то абуджэнне прыроды, то вясёлыя песні, то заліхвацкі вясковы танец.

Пасля рэпетыцыі Фёдар Адольфавіч падзяліўся з намі чарговымі задумамі, расказаў пра клопаты сельскай самадзейнасці, пра работу ў школе...

А. ДЗЯРУГІН,
супрацоўнік Нараўлянскай раённай газеты «Прыпяцкая праўда».

АЎТАКЛУБ ПРЫЕХАЎ!

ЗАГАДЧЫЦА аўтаклуба Ева Сергіевіч у апошні раз правярае, ці ўсё падрыхтавана да чарговага рэйсу. Сёння ў саўгасе «Ждановічы» аўтаклуб праводзіць тэматычны вечар «У бітве вялікай свой край адстаялі». Здаецца, усё на месцы, усе ў зборы... А вось і госці, якія разам з аўтаклубам паедуць у саўгас. Гэта былы сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі Герой Савецкага Саюза Раман Навумавіч Мачульскі і ўдзельнік вялікай бітвы на Волзе палкоўнік запасу Уладзімір Аляксеевіч Аляксееў.

...Вялікую, неабходную работу праводзіць аўтаклуб Мінскага раёна, які арганізаваны не так даўно—у 1970 годзе. А колькі добрых слоў сказана жыхарамі раёна ў яго адрас!

У мінулым годзе аўтаклуб пабываў ва ўсіх гаспадарках раёна з праграмай, прысвечанай 50-годдзю ўтварэння СССР. Перад хлебаробамі выступалі палітінфарматары, воіны Савецкай Арміі. Паказвалі сваё майстэрства народны артыст СССР Яўген Максімавіч Палосін і выканаўца ролі У. І. Леніна Аляксандр Аляксандравіч Даброцін.

На сустрэчы выязджалі лепшыя агітбрыгады раёна. Паказвалі канцэрты, выстаўкі, дэманстравалі фільмы.

Аўтаклуб плануе вечары на такія тэмы: мастацка-палітычная работа, ваенна-патрыятычнае, інтэрнацыянальнае і эстэтычнае выхаванне, тэматычныя праграмы «За здаровы быт». Пра кожны вечар асобна паведамляецца ўсім гаспадаркам раёна. Сваю работу аўтаклуб вядзе сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з раённай арганізацыяй таварыства «Веды» і партарганізацыямі гаспадарак. Не застаюцца ўбаку педагогі і мясцовая інтэлігенцыя.

Цікава праходзяць вечары, прысвечаныя ўрачыстым провадам моладзі ў рады Савецкай Арміі, сустрэчы баявых сяброў—былых партызан, святы працы і песні. З дапамогай партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый аўтаклуб арганізуе паходы па мясцінах баявой і працоўнай славы, калектыўныя наведванні музеяў, Кургана Славы, Хатыні, Брэсцкай крэпасці-героя.

...І цяпер, пакуль аўтаклуб яшчэ ў дарозе, а ў доме культуры саўгаса «Ждановічы» даўно падрыхтаваліся да сустрэчы. У глядзельнай зале экспануецца перасоўная выстаўка «Вялікая бітва». Кожны, хто наведаў яе, застаўся задаволены.

У актыве аўтаклуба больш за трыццаць такіх вечароў. Зараз плануецца работа на наступны год.

Я. ХВАЛЕЙ,
ст. метадыст Мінскага абласнога дома народнай творчасці.

Старшына міліцыі, камандзір аддзялення Брэсцкага ГАУС Рыгор Пятровіч Касянкоў вялікі аматар прыроды.

Зімою і летам у выхадныя дні яго можна сустрэць у ваколіцах Брэста, на маляўнічым беразе ракі Мухавец. Вяртаючыся з прагулак, ён абавязкова прыносіць у сваім рукзаку мудрагелістыя сучкі, карэньчыкі, шышкі.

Лясныя сувеніры ва ўмелых руках ператвараюцца ў экзатычных звяркоў, птушак, рыбак...

Для сваіх работ Рыгор Пятровіч выкарыстоўвае таксама косці, рогі і іншыя цвёрдыя матэрыялы.

Гэтым ён займаецца каля дзесяці год. Зараз у яго калекцыі больш за сто экспанатаў.

Б. МАЗАЛЕУСКІ, інструктар МУС БССР.

На здымку — Р. П. Касянкоў у сваёй майстэрні.

Фота В. МАРТЫШКІНА.

АДЗІН З ПЯТНАЦЦАЦІ...

ВЯЛІКУЮ і вельмі патрэбную работу па прапагандзе фільмаў для дзяцей ажыццяўляе мінскі кінатэатр «Піянер» і яго філіялы — 15 школьных кінатэатраў-спадарожнікаў.

Адзін з іх дзейнічае ў школе № 117. Сёлета на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе ён заняў першае месца. Ля ўваходу ў кінатэатр прыгожа афармленыя афішы і плакаты. Адны знаёмяць з прэм'ерай тэатра юнага гледача, другія запрашаюць на кінапрагляд у «Піянер», які абсталяваны навейшай апаратурай. Глядзельная зала з вялікай сцэнай. На ўсю сцяну экран. Акрамя традыцыйных школьных вечароў, ранішнікаў, аглядаў мастацкай самадзейнасці, тут арганізуюцца сустрэчы з цікавымі людзьмі. У гасцях у школьнікаў пабывала група стваральнікаў беларускага фільма «Бацька»: рэжысёр-пастаноўшчык Барыс Сцяпанаў, сцэнарыст Расціслаў Шмыроў, заслужаны артыст БССР Барыс Уладамірскі і выканаўца ролі Лізы школьніца Іра Байкоўская. Шмат цікавага даведаліся зд іх юныя аматары кіно. На тыдні дзіцячай музыкі вучняў наведалі работнікі студыі радыё і тэлебачання.

Гэтыя і іншыя мерапрыемствы на базе школьнага кінатэатра ажыццяўляе так званы «Клуб выхаднога дня».

...У кабінет дырэктара школы І. А. Карташовай прыйшоў высокі хударлявы юнак. Ён просіць Ірыну Аляксандраўну падпісаць нейкую паперу. Юнак — гэта і ёсць дырэктар кінатэатра дзесяцікласнік Валодзя Наўмовіч. Зараз ён разам з піянерважатымі накіроўваецца за новым фільмам. «Цяжка прадугледзець, канечне, як складзецца лёс у гэтых юнакоў, — гаворыць дырэктар школы, — але адно добра вядома: удзел у рабоце школьнага кінатэатра выхоўвае ў дзяцей ініцыятыўнасць, пачуццё адказнасці, арганізацыйныя здольнасці. Каб вы толькі бачылі, як актыўна рыхтуюць яны кожны сеанс... Вельмі важна навучыць хлопчыкаў і дзяўчат разумець мову мастацтва. Бо кожная карціна— гэта плён чалавечай працы».

Хіба не таму так цікава і захапляюча праходзяць тут дыспуты і абмеркаванні фільмаў, а пасля праглядаў некаторых з іх — «Дзівак з 5 «Б» і «Зімародак» —у школе нават быў аб'яўлены конкурс на лепшае сачыненне-рэцэнзію. І менавіта тут, у «Піянеры» на фестывалі мультфільмаў вучні малодшых класаў упершыню даведаліся, што Чабурашка — не проста смешная, недарэчная істота, і што вельмі добра было б, калі б кожны школьнік імкнуўся быць такім жа добрым, чулым, гатовым заўжды прыйсці на дапамогу...

Напярэдадні святкавання 50-годдзя ўтварэння СССР тут на працягу двух месяцаў юныя гледачы з дапамогай дакументальных стужак і кіначасопісаў, якія створаны саюзнымі студыямі, рабілі захапляючыя падарожжы па краіне Саветаў, знаёміліся з бытам і традыцыямі, гаспадарчымі і культурнымі поспехамі братніх народаў.

Для старшакласнікаў пры кінатэатры «Піянер» увесь час існуе лекторый «Подзвіг». Ён прапаноўвае іх увазе дакументальныя стужкі на ваенна-патрыятычную тэму. А ў піянераў — свой клуб «Заўжды гатоў».

У планах кінатэатра шмат цікавага. У гэтым навучальным годзе тут будуць уведзены кінаабанементы на «Клуб рознакаляровых гальштукаў». Першыя яго заняткі адбудуцца ў канцы кастрычніка гэтага года. Яго мэта — інтэрнацыянальнае выхаванне вучняў. Дэманстрацыя лепшых стужак сацыялістычных краін будзе суправаджацца гутаркамі аб жыцці братніх піянерскіх арганізацый... А для вучняў старэйшых класаў ствараецца кінаклуб «Мараль і права».

...Мы пазнаёміліся толькі з адным з пятнаццаці спадарожнікаў спецыялізаванага дзіцячага кінатэатра «Піянер». Умела кіруе імі Фаіна Іванаўна Люцко — вопытны адміністратар, удумлівы педагог і чулы выхавацель.

А. ЧАРНУШЭВІЧ.

З КЛОПАТАМ АБ ЛЮДЗЯХ

ВЫДАТНАЯ і надзвычай цікавая гісторыя ў старэйшай бібліятэкі рэспублікі, якая знаходзіцца ў вёсцы Вялікая Кракотка, што на Слонімшчыне. Сорак пяць гадоў назад па ініцыятыве членаў КПЗБ была створана легальная сельская бібліятэка, якой крыху пазней было прысвоена імя Янкі Купалы.

З таго часу бібліятэка стала не толькі культурным, але і рэвалюцыйным цэнтрам для жыхароў навакольных вёсак. Сюды збіраліся камуністы і камсамольцы і тайна вывучалі творы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. Леніна. Тут вялі падпольную работу члены КПЗБ Рыгор і Сямён Акулевічы, Сямён і Аляксандр Жыткевічы.

Сапраўдны кнігалюб і шчыры прапагандыст кнігі Аляксандр Жыткевіч хадзіў у тыя далёкія гады разам з аднавяскоўцамі па дварах і збіраў кнігі. Але ці многа іх было ў малапісьменных сялян? Аднак тое-сёе сабралі. Ды і на гэтым не спыніўся аматар кнігі. Ён стаў збіраць грошы на пабудову хаты для бібліятэкі. І хату пабудавалі. Пра культурную ўстанову даведаліся студэнты-аднавяскоўцы, якія займаліся ў Віленскай гімназіі. З дапамогай маладога паэта Валянціна Таўлая было сабрана каля тысячы кніг рускай, беларускай, украінскай літаратуры.

Паліцыя, напалоханая рэвалюцыйнымі настроямі сялян, у 1932 годзе закрыла бібліятэку, канфіскавала яе фонд. Але не ўсе кнігі трапілі ў рукі пілсудчыкаў. Аляксандр Жыткевіч і яго сябры схавалі некаторыя кнігі.

Настаў 1939 год. Год, які прынёс працоўным Заходняй Беларусі свабоду. Жыхары вёскі Вялікая Кракотка сталі гаспадарамі свайго лёсу. Цяпер сяляне вечарамі збіраліся ў народным доме, каб паслухаць навіны, пачытаць газеты і часопісы, паспяваць любімыя песні. І тут зноў на чале культурнага аднаўлення сяла стаяў Аляксандр Іванавіч Жыткевіч.

Але хутка абарвалася мірнае жыццё кракоткінцаў: пачалася Вялікая Айчынная вайна. Многія пайшлі на фронт, партызаніць у лясы. Фашысты разграбілі і знішчылі бібліятэку. Аматарам кнігі ўдалося выратаваць толькі невялікую колькасць экземпляраў.

Калі пасля разгрому чужынцаў у роднае сяло вярнуліся былыя воіны і партызаны, яны адразу ж узяліся за аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі. Не забыліся сяляне Вялікай Кракоткі і пра сваю бібліятэку. І на гэты раз сярод энтузіястаў быў кавалер ордэна Айчыннай вайны, інвалід другой групы Аляксандр Іванавіч Жыткевіч. На дапамогу зноў жа прыйшлі аднавяскоўцы. Яны сабралі грошы і закупілі некаторую колькасць кніг. Выпісалі таксама часопісы, газеты. Сельскі савет выдзеліў памяшканне для бібліятэкі, а таксама грашовыя сродкі. Загадчыкам бібліятэкі паставілі А. Жыткевіча. Так адбылося трэцяе нараджэнне бібліятэкі вёскі Вялікая Кракотка. Ён наладзіў перапіску з пісьменнікамі рэспублікі. І пісьменнікі прыйшлі на дапамогу. А жонка Янкі Купалы Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, даведаўшыся, што ў Гродзенскай вобласці ёсць сельская бібліятэка, якая носіць імя беларускага песняра, адабрала з асабістай бібліятэкі 150 экземпляраў кніг, фотаздымкі паэта і прывезла іх у дар хлебаробам Вялікай Кракоткі. Пазней у бібліятэцы калгаса імя Дзяржынскага пабывалі П. Броўка, П. Пестрак, Я. Брыль, П. Глебка і многія іншыя беларускія літаратары. Яны падаравалі ёй не толькі свае ўласныя творы, але і творы сваіх сяброў. Цяпер кніжны фонд бібліятэкі складае больш як 10 тысяч экземпляраў. У яе каля 500 чытачоў.

Бібліятэка праводзіць шырокую прапаганду літаратуры. У цікавых экспанатах і яркіх дыяграмах раскрываюцца дасягненні мясцовага калгаса, паказваюцца перспектывы развіцця гаспадаркі.

Часта праводзяцца гутаркі, у якіх прымаюць удзел былыя падпольшчыкі, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, перадавыя людзі калгаса.

Варта адзначыць, што з дапамогай Кракоцкай бібліятэкі быў адкрыты калгасны гісторыка - рэвалюцыйны музей. У гэтай справе вялікую дапамогу камсамольцам і моладзі аказаў А. Жыткевіч. Дакументы, фатаграфіі, асабістыя рэчы падпольшчыкаў, воінаў і партызан — усё збіраў Аляксандр Жыткевіч для музея, каб аднавіць гераічнае мінулае аднавяскоўцаў.

З павагай і любоўю адносяцца калгаснікі да свайго земляка, сапраўднага кнігалюба Аляксандра Іванавіча Жыткевіча, які амаль трыццаць гадоў быў загадчыкам бібліятэкі. Зараз А. Жыткевіч на заслужаным адпачынку. Але ён і дня не можа пражыць, каб не наведаць сельскую бібліятэку. Яго можна бачыць таксама на калгаснай ферме, у паляводчых брыгадах. Да ўсяго яму справа, бо само жыццё яго — штодзённы клопат чалавека, барацьбіта, грамадзяніна.

Ю. КОРЖЫКАЎ.

Вялікім попытам у насельніцтва карыстаюцца тавары Баранавіцкай фабрыкі мастацкіх вырабаў. Вязаныя шалікі, рукавічкі, шкарпэткі прыйшліся да спадобы пакупнікам.

Зараз тут наладжан выпуск жаночых сумачак з лазы.

НА ЗДЫМКАХ:

Камсамолкі Эльвіра Мацяс (злева) і Ганна Кунаш разглядаюць толькі што сплеценую імі сумачку.

Работніца фабрыкі Галіна Вірэўчык пляце новую сумачку.

Фота Р. АЛЫМАВА.



Такі ён быў, Менгар Тарабаш. (У цэнтры).

ПАРУЧНІК Менгар Тарабаш

В ЯСНОЮ 1943 года нямецкае камандаванне перакінула з раёна Хойнік у Слуцк славацкую дывізію. У нямецкіх генералаў былі сур'ёзныя падставы памяняць дыслакацыю дывізіі — сярод славацкіх салдат і афіцэраў, з якімі ўстанавілі сувязь палескія партызаны, праяўляліся антыгітлераўскія настроі. Але перадыслакацыя не дапамагла. Славацкія салдаты і афіцэры і на новым месцы пачалі наладжваць сувязь з савецкім падполлем, мясцовымі партызанскімі атрадамі.

Аб настроях сярод славакаў, якія былі тады ў Слуцку, сведчаць такія факты Ідучы ў горадзе ў страі, славакі нярэдка спявалі... «Кацюшу» і іншыя савецкія песні. Аднойчы на Слуцкім гарадскім стадыёне адбыўся матч паміж футбольнымі камандамі славацкай дывізіі і нямецкіх часцей гарнізона. Перамагла славацкая каманда. Славацкай камандзе была наладжана случанамі бурная авацыя, а падпольшчыкі, выкарыстаўшы шум, раскідалі над трыбунамі стадыёна сотні лістовак. Лістоўкі заклікалі славацкіх салдат і афіцэраў пераходзіць на наш бок, каб разам змагацца супраць фашызму.

За тры - чатыры няпоўныя месяцы, што дывізія знаходзілася ў Слуцку, да партызан перайшло некалькі груп славацкіх салдат і афіцэраў. У нашу зону перайшоў з групай салдат камандзір роты 102-га славацкага палка паручнік Менгар Тарабаш. Партызанскае камандаванне прызначыла яго камандзірам узвода атрада імя Мікалая Астроўскага брыгады імя Суворава.

У многіх баявых аперацыях удзельнічаў Менгар Тарабаш са сваім узводам. 19 красавіка 1944 года ён загінуў смерцю героя.

Раніцою таго дня фашысты пачалі наступленне на нас з раёна вёскі Шышчыцы ў напрамку на вёску Жылін Брод.

У раёне вёсак Жылін Брод — Пераходы абарону займаў атрад імя Астроўскага. Фашыстам удалося прарвацца ў Пераходы. Яны адкрылі моцны агонь па леваму флангу атрада імя Астроўскага, і левы фланг астроўцаў пачаў адыходзіць.

Лагер нашага атрада імя Ракасоўскага брыгады імя Фрунзе размяшчаўся недалёка ад вёскі Пераходы. Было ясна, што ворагі вось-вось прарвуцца і да нас. Таму наш камандзір А. Фамін прыняў рашэнне выйсці насустрач. Разам з разведчыкамі ён паскакаў наперад для высвятлення становішча. І тут натыкнуўся на астроўцаў, сярод якіх быў паручнік Менгар Тарабаш са сваім узводам.

— Таварыш камандзір, вазьміце нас з сабою, — папрасіў Тарабаш, калі ўбачыў, што атрад ідзе займаць абарону на рацэ Высейка.

Фамін згадзіўся.

Больш дзвюх гадзін мы трымалі абарону. Нас было каля сарака чалавек, ды Тарабаш з трыма-пяццю партызанамі. А ворагаў — каля дзвюх соцень. У іх мінамёты, кулямёты, а ў нас не хапае патронаў. І ўсё-такі камандзір прымае рашэнне атакаваць. Не буду расказваць, як ішла атака. Скажу толькі — ціскалі мы як след. І вораг у паніцы пачаў адыходзіць, кідаючы забітых, параненых, зброю і вайсковы рыштунак. У гэты момант варожая чарга і скасіла Менгара Тарабаша...

Пасля бою мы з вайсковым ушанаваннем пахавалі мужнага партызана-славака і іншых загінуўшых.

Прайшлі гады.

У 1959 годзе ў газеце «Рудэ права», цэнтральным органе кампартыі ЧССР, быў надрукаваны артыкул «Дружба, замацаваная крывёю», які я напісаў у сааўтарстве з былым камандзірам атрада Фаміным.

У хуткім часе прыйшло пісьмо з Чэхаславакіі. Напісала яго Бэта Паўлючкова, чэхаславацкая камсамолка. Яна паведаміла, што з ёю на адным заводзе працуе родны брат Менгара Тарабаша Павел Тарабаш. Так устанавілася сувязь са сваякамі М. Тарабаша, якія прыслалі нам фотаздымкі Менгара.

Перапіска з Бэтай Паўлючковай і роднымі Менгара Тарабаша працягваецца ўжо больш 10 гадоў.

Жыхары вёскі Жылін Брод шануюць памяць Менгара Тарабаша, як і ўсіх народных мсціўцаў, якія аддалі сваё жыццё за свабоду Радзімы.

Рыгор РОДЧАНКА,
былы партызан Слуцкага злучэння.

Уладзіслаў НЯДЗВЕДСКІ

Не стала Уладзіслава Нядзведскага. Няма сярод нас сціплага таварыша, таленавітага паэта і празаіка.

Жыццёвая дарога Уладзіслава Нядзведскага пачалася ў вёсцы Рахавічы былога Старобінскага раёна Мінскай вобласці. На долю падлетка выпалі нялёгкія гады вайны. У час адной з блакад партызанскага раёна на вачах у будучага паэта былі расстраляны гітлераўцамі бацькі і малодшыя браты. Гэта трагедыя на ўсё жыццё пакінула незагойную рану ў сэрцы Уладзіслава Нядзведскага. Радзіма, савецкія людзі не забыліся на сірату. Пасля вайны ён выхоўваўся ў Мікашэвіцкім дзіцячым доме.

Паэтычныя здольнасці Уладзіслава Нядзведскага надзвычай ярка праявіліся ў гады вучобы ў БДУ імя У. І. Леніна. Яго вершы часта з'яўляліся на старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў. Скончыўшы універсітэт, Уладзіслаў Нядзведскі выкладаў родную мову і літаратуру на Лагойшчыне, працаваў на Беларускім тэлебачанні і ў рэдакцыі часопіса «Маладосць». Адна за адной выходзілі кнігі пісьменніка: «Вясновыя барозны», «Запрашэнне», «Сто братоў і сясцёр», «У лясной старане», «Размова з адсутнымі».

Уладзіслаў Нядзведскі заўсёды адчуваў пульс нашага жыцця. Ён адзін з першых звярнуўся да новай тэмы ў беларускай літаратуры, уславіўшы ў паэтычных рэпартажах працу салігорскіх шахцёраў. Актыўна працаваў Уладзіслаў Нядзведскі і ў жанры прозы. Ягоная аповесць «Хлопцы з другога корпуса» вытрымала некалькі выданняў. Светлай усмешкай і дасціпнасцю адзначаны гумарыстычныя творы Ул. Нядзведскага: «Капронавыя галёшы», «Начная пагоня». Чалавек самабытнага таленту, шырокіх здольнасцей, Уладзіслаў добра зарэкамендаваў сябе і як паэт-перакладчык.

На беларускую мову Уладзіслаў пераклаў паасобныя творы з польскай класікі, а таксама вершы паэтаў братніх рэспублік нашай краіны.

Чалавек нямоцнага здароўя, Уладзіслаў працаваў да апошняга свайго дня. На яго пісьмовым стале і ў рэдакцыях засталіся пакуль не надрукаваныя рэчы. Яны ўбачаць свет. Шкада, што Уладзіслаў не зможа разам з намі парадавацца іх поспеху.

Наш таварыш быў не толькі таленавіты пісьменнік, але і ўдумлівы, патрабавальны рэдактар. Паэтычныя кнігі, якія ён любоўна і з пашанай да аўтара рэдагаваў, якім аддаў часціну свайго таленту і сэрца, — удзячны напамін аб ягонай працы, аб ім самім.

Вершы і паэмы, празаічныя творы, сатыра і гумар — усё надоўга застанецца ў спадчыне беларускай літаратуры.

Не стала друга, таварыша, чалавека добрай душы. Няма сярод нас Уладзіслава Нядзведскага. Памяць аб ім мы назаўсёды захаваем у сваіх сэрцах.

Група таварышаў.

Калектыў выдавецтва «Мастацкая літаратура» смуткуе з прычыны раптоўнай смерці рэдактара Нядзведскага Уладзіслава Іосіфавіча і выказвае глыбокае спачуванне сям'і, родным і блізкім нябожчыка.

Прэзідыум, партыйная арганізацыя і мясцовы камітэт Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры выказваюць глыбокае спачуванне старшыні Брэсцкага абкома прафсаюза работнікаў культуры Л. І. Шумскай у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ВУЧОНЫ-ЭНЦЫКЛАПЕДЫСТ

Усё прагрэсіўнае чалавецтва нашай планеты шырока адзначае 300-годдзе з дня нараджэння малдаўскага філосафа, гісторыка, літаратара, археолага, музыканта Дзмітрыя Канцеміра. Урачыстасці праводзяцца па рашэнню ЮНЕСКА.

Палымяны патрыёт, мыслярэль, прагрэсіўны грамадска-палітычны дзеяч сваёй эпохі Дзмітрый Канцемір бачыў гарантыю і незалежнасць сваёй Радзімы ў саюзе з Расіяй, ён сцвярджаў павагу да ўсіх народаў, імкненне кожнага народа да свабоды і асветы.

У сталіцы братняй Малдавіі — Кішынёве ў гэтыя дні адбываюцца ўрачыстасці з нагоды юбілею Дзмітрыя Канцеміра: вечары, навуковыя сесіі. Ушанаваць памяць вялікага сына малдаўскага народа прыехалі дэлегацыі з братніх рэспублік Савецкага Саюза. У склад беларускай дэлегацыі ўвайшлі акадэмік Акадэміі навук БССР Казімір Буслаў, доктар філалагічных навук Юліян Пшыркоў і адказны сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Аляксей Кулакоўскі.

ПАМЯТНЫЯ ПАДАРУНКІ— КНІГІ З АЎТОГРАФАМІ

На Брэсцкім панчошным камбінаце адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны газеце «Звязда». Яго ўдзельнікі — перадавыя рабочыя прадпрыемства ў літаратурна - музычнай кампазіцыі расказалі аб шляхах, якія прайшла за 56 год старэйшая беларуская газета, аб вядомых пісьменніках Беларусі, што пачыналі творчы шлях са старонак «Звязды», прачыталі іх творы.

На вечары выступілі былы супрацоўнік газеты А. Л. Матусевіч, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі рэдакцыі А. І. Падбярозны. Апошні з іх актывістам па прапагандзе і распаўсюджванню «Звязды» і ўдзельнікам вечара ўручыў памятныя падарункі — першы нумар газеты і кнігі з аўтографамі беларускіх пісьменнікаў Івана Грамовіча, Валянціна Мысліўца, Еўдакіі Лось, Браніслава Спрынчана і іншых.

На вітрыне «Кнігі бліжэйшых супрацоўнікаў «Звязды», афармленай работнікамі абласной бібліятэкі імя Горкага, было выстаўлена каля 30 выданняў з творамі пісьменнікаў, якія ў розны час друкаваліся на старонках «Звязды».

На літаратурным вечары выступіў брэсцкі паэт Іван Арабейка. Ён расказаў аб творчай працы над паэмай «Сцяна», прысвечанай абаронцам Брэсцкай крэпасці-героя, якая змешчана днямі на старонках абласной газеты «Зоря».

П. АЛЕСІН.

СУСТРЭЧЫ З ЛІТАРАТАРАМІ

Днямі кнігалюбы, якія наведалі Цэнтральны кніжны магазін у Мінску, мелі цікавую гутарку з паэтамі: да іх прыйшлі ў госці Васіль Вітка, Міхась Калачынскі, Хаім Мальцінскі. Яны расказалі аматарам мастацкага слова аб развіцці беларускай літаратуры, аб тых задачах, якія стаяць зараз перад вялікім атрадам беларускіх празаікаў і паэтаў, адказалі на шматлікія пытанні. У той дзень многія кнігі перасяліліся з паліц магазіна ў асабістыя бібліятэкі кнігалюбаў.

Перад студэнтамі медыцынскага інстытута выступілі паэт Анатоль Грачанікаў і крытык Рыгор Бярозкін.

Цікавыя, змястоўныя сустрэчы літаратараў з рабочымі, інтэлігенцыяй, студэнтамі, канферэнцыі чытачоў, літаратурныя вечары адбыліся таксама на заводах і фабрыках, у палацах культуры і бібліятэках сталіцы. Яны былі прысвечаны Тыдню маладзёжнай кнігі, які праводзіўся ў рэспубліцы.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

«ЗЯЛЁНЫ ГАЙ НАД БУГАМ»

Пад такой назвай у № 33 нашага штотыднёвіка быў апублікаваны артыкул Р. Бакіевіча аб рабоце Брэсцкага парку культуры і адпачынку.

Начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкома Б. Булатаў паведаміў рэдакцыі наступнае:

«Сёлета значна ажывілася работа спартыўнай пляцоўкі, дзе праводзіліся міжнародныя, рэспубліканскія, абласныя і гарадскія спаборніцтвы. Прымаюцца захады, каб у наступным годзе ўсе лепшыя самадзейныя калектывы вобласці выступілі з канцэртамі ў парку. Распрацоўваецца графік іх выступленняў, рыхтуюцца новыя канцэртныя праграмы.

Мяркуецца ў наступным годзе пачаць будаўніцтва зімовай танцавальнай залы. Выканком Брэсцкага гарсавета вырашыў у 1974 г. пабудаваць у парку новы гандлёвы павільён.

У 1973—74 гг. будзе пашыраны гардэроб на 300 месц, а ў 1975 годзе ўступіць у строй новы сучасны гардэроб на 1000 месц».

САМАЕ ЦУДОЎНАЕ СЛОВА

Я належу да пакалення, выгадаванага на парозе другой сусветнай вайны. Маю дзіцячую калыску разгойдвалі парахавыя вятры. Мае першыя крокі суправаджаліся грукатам танкавых гусеніц. Мне ішоў трэці год, калі ўзброеныя да зубоў фашысцкія полчышчы напалі на Савецкі Саюз. Маімі першымі словамі, вывучанымі адначасова з такімі як «мама», «хлеб», «вада», былі «мір», «вайна», «Расія». У шэсць гадоў я быў адным з мноства маіх аднагодкаў, якія сустракалі байцоў-вызваліцеляў, таму што іх ваенныя калоны прайшлі праз маё роднае сяло. Памятаю і ніколі не забуду, як сярод той усеагульнай радасці да мяне нахіліўся савецкі салдат, узяў на рукі і мігам узняў высока-высока над сваёй галавой. Гэта — жыццёвы выпадак. А гучыць, як метафара. Як сімвал. Таму што праз гады я пазнаў пра мільёны ахвяр, пра вялікія страты, якія панёс Савецкі Саюз і чалавецтва ў перыяд другой сусветнай вайны. Я даведаўся і пра помнік, устаноўлены ў Берліне ў гонар воінаў Савецкай Арміі. Магчыма, ён у гонар таго Невядомага салдата, які ўзняў мяне на руках восенню 1944 года. Там застыў ён у вечным маўчанні. І на руках яго — выратаванае дзіця. А выратаванае дзіця — гэта будучыня чалавецтва...

Я, зразумела, не забываю пра час, у які жыву. Памятаю і словы Уладзіміра Ільіча Леніна аб тым, што войны караняцца ў самой сутнасці капіталізму: яны спыняцца толькі тады, калі перастане існаваць капіталістычны лад. А адна з рускіх прымавак гаворыць: «Няма мора без вады, няма вайны без крыві».

І ў гэтыя мінуты ўспамінаю адзін з вечароў першага фестывалю дружбы савецкай і балгарскай моладзі, які праходзіў у чэрвені 1971 года ў Кіеве. Пад зорным небам горада-героя мы, тысячы савецкіх і балгарскіх юнакоў і дзяўчат, ускладалі гірлянды кветак ля помніка Невядомаму салдату, збудаванаму на беразе Дняпра. Цішыня. І ў цішыні прагучэлі магутныя гукі: «Вставай, страна огромная, вставай на смертный бой...». Я маўчаў і ўяўляў, калі ўвесь савецкі народ узнімаўся супраць фашысцкай сілы цёмнай, узнімаўся на абарону сваёй свяшчэннай зямлі, каб адпомсціць за забітых дзяцей, за знявечаныя бярозы, за спаленыя вёскі і пшанічныя палі... Узнімаўся на абарону міру і жыцця. Ніколі не забуду гэты кіеўскі вечар. Мы, пакланіўшыся, схілялем галовы перад подзвігам і памяццю 20 мільёнаў ахвяр, якія зямля Леніна панесла ў час другой сусветнай вайны. А каля мяне стаяў незнаёмы савецкі хлопец. І па яго шчаках цяклі слёзы. Павольныя і цяжкія слёзы, у якіх, здавалася, адбіваліся ўсе пакуты і ўвесь боль за людзей, якія загінулі на вайне. І там, ля помніка Невядомаму салдату, я зразумеў, што на нас, маладых, ляжыць вялікая адказнасць. Адказнасць за мір.

Мір — гэта самае цудоўнае слова ў слоўніку жыцця.

Жыць. І ведаць, што ёсць мір. Ці ёсць большае шчасце, чым гэта?

Але я не забываю і нешта іншае. Цяпер маёй дачцэ шэсць гадоў. Кожную раніцу я ваджу яе ў дзіцячы сад. І купляю свежую газету. Вочы мае ўпарта шукаюць палітычныя навіны. І я радуюся, калі чытаю: «Карабель «Саюз-12» вярнуўся на зямлю». І ўздрыгваю, убачыўшы загаловак: «Крывавыя рэпрэсіі ў Чылі працягваюцца». Ці магу я быць спакойным, калі тысячы і мільёны бацькоў і мацярок на зямлі знаходзяцца ў пастаяннай турбоце? Ледзь толькі пачалі зарастаць раны на в'етнамскай зямлі, а на планеце ўспыхваюць новыя пажары, новыя ачагі вайны. І мне хочацца крыкнуць: «Хопіць!»

Так, мы павінны змагацца, каб адстаяць мір. І гэта — неад'емны абавязак кожнага сумленнага чалавека на зямлі. У імя гэтага, Сусветны кангрэс міру ўзнімае свой магутны голас у Маскве. Гэта — голас усяго прагрэсіўнага чалавецтва.

Мацей ШОПКІН,
сакратар Саюза балгарскіх пісьменнікаў.



У горадзе Плевене пабудаваны буйнейшы ў Балгарыі Дом кнігі. Будынак пабудаваны па тыпу Дома кнігі ў Маскве. Яго экспазіцыйная плошча 4.500 кв. м. Тут знаходзіцца два буйнейшыя ў краіне кніжныя магазіны балгарскай і савецкай літаратуры, магазін дзіцячай кнігі, магазін музычнай літаратуры. У Доме кнігі дзейнічае пастаянная выстаўка-продаж кнігі.

На фота — частка аддзела мастацкай літаратуры.

Фота В. МІЛАНАВА.

БАЛГАРСКІ ЖЫВАПІС І ПЕРШАЕ АНТЫФАШЫСЦКАЕ ПАЎСТАННЕ Ў СВЕЦЕ

Калі нарадзілася першая карціна аб Верасні, пра першае ў свеце антыфашысцкае паўстанне, якое ўспыхнула ў Балгарыі ў верасні 1923 года, хто яе аўтар, у творчасці якіх мастакоў знайшла адлюстраванне тэма паўстання, якое месца яна займае ў творчасці маладых?.. Адказаць на гэтыя пытанні мы папрасілі дырэктара Нацыянальнай мастацкай галерэі Дзімітра Остыча. Вось што ён нам расказаў: Вераснёўскае паўстанне 1923 года займае цэнтральнае месца ў творчасці балгарскіх мастакоў. Так у 1923 годзе з'яўляецца карціна Івана Мілева «Верасень 1923 года», вострым сатырычным пяром Ілья Бешкаў, Аляксандр Жэндаў і Стоян Венеў выносяць своеасаблівы прыгавор фашызму. Жэндаў, які ў гэты час знаходзіцца ў эміграцыі, арганізуе ў Германіі выстаўку, накіраваную супраць зверстваў і злачынстваў фашызму. Паўстанне хвалюе дзеячоў вяўяўленчага мастацтва і ў наступныя гады — Іван Мілеў вяртаецца да гэтай тэмы ў 1926 годзе (карціны «Нашы маці ўсе ў чорным ходзяць» і «Шумі, Марыца акрываўленая»), у 1933 годзе Барыс Іванаў прысвячае Вераснёўскаму паўстанню маляўнічыя кампазіцыі «Піета» і «Кампазіцыя», Ілья Петраў стварае ў 1940 годзе серыю афортаў «Верасень 1923 года», 1932 годам датуецца твор Ненка Балканскага «Бунт»...

Пасля перамогі паўстання 9 верасня 1944 года, калі наша краіна з рашаючай дапамогай Савецкай Арміі вызвалілася ад фашызму і пайшла па шляху сацыялізма, тэма Верасня 1923 года не толькі не перастала хваляваць балгарскіх мастакоў, але знайшла адну са сваіх найбольш значных інтэрпрэтацый. Хрысто Нейкаў стварае серыю графічных твораў, Дзечка Узунаў — карціну «Напярэдадні», Ілья Петраў — «Веснік», Стоян Венеў — «Балгарская маці маладзецкая», «Народ паўстаў», «Поп Андрэй», Цэнко Баяджыеў — «Самі», «На бунт», Найдзен Пяткоў — «Расстрэл», Светлін Русеў — «Верасень 1923 года», Дзімітр Кіраў — «Развітанне», Іван Кіркаў — «Піета». Немагчыма пералічыць усе творы на тэму Вераснёўскага паўстання 1923 года, аддаць перавагу адным або іншым, таму што ўсе яны пасвойму цікавыя, арыгінальныя па задуме.

Амаль на ўсіх агульных мастацкіх выстаўках у гады народнай улады гэтая тэма займала значнае месца, а выстаўкі ў 1948 і 1963 гадах былі поўнасцю ёй прысвечаны. Сёлета ў сувязі з 50-годдзем паўстання гэтая тэма стала асноўнай у творчасці мастакоў. Калі меркаваць па іх актыўнасці ў мінулым годзе, у якім было арганізавана пяць агульных выставак на высокім мастацкім узроўні, то ў нас усе падставы спадзявацца, што агульная мастацкая выстаўка гэтага года, прысвечаная Верасню, парадуе гледачоў многімі цікавымі творамі. Акрамя Сафіі, выстаўка будзе паказана і ў іншых гарадах нашай краіны і перш за ўсё ў Міхайлаўградскім, Слівенскім, Старазагорскім, Пазарджыкскім акругах, дзе раней і найбольш моцна ўспыхнулі агні паўстання паўвека назад.

«Сафія-прэс».

РЭФАРМАТАР СЦЭНЫ АБ АКЦЁРСКІМ МАСТАЦТВЕ

У Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы выдавецтва Хеншэль выпусціла ў свет зборнік артыкулаў і выказванняў лаўрэата Міжнароднай Ленінскай прэміі «За ўмацаванне міру паміж народамі» Бертальда Брэхта. Кніга так і называецца — «Брэхт аб акцёрскім мастацтве». Тут змешчаны тэарэтычныя працы выдатнага драматурга і тэатральнага дзеяча аб мастацтве наогул і тэатры, у прыватнасці, пра «сакрэты» творчасці акцёра, пра манеру ігры такіх праслаўленых майстроў сучаснай сцэны, як Елена Вайгель, Чарлз Лаўтан і Эрнст Буш.

Часопіс «Тэатр».

ТЭМАТЫЧНЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ

Выстаўка работ Ласла Барты з'явілася яркім сведчаннем майстэрскай сталасці гэтага мастака.

Імя Ласла Барты стала вядомым пасля першай выстаўкі яго твораў, якая адбылася ў саракавых гадах. Пасля заканчэння сталічнай Акадэміі мастацтваў ён накіроўваецца на два гады ў Італію. Аднак яго справаздачныя работы італьянскага перыяду з'явіліся поўнай нечаканасцю для афіцыяльных абаронцаў яго таленту. У тыя часы маладых таленавітых выпускнікоў Акадэміі пасылалі менавіта ў Італію, дзе вымуштраванае фашыстамі «мастацтва» павінна было «спрыяльна» ўплываць і на венгерскіх мастакоў, ператвараючы іх у рупары той ці іншай ідэалогіі і на радзіме. Маладзі Барта быў вартым пераемнікам той мастацкай плыні, ад якой больш за ўсё стараліся «засцерагчы» венгерскае мастацтва: парыжскай школы жыванісу Эколь дэ Пары.

Вядома, пераемніцтва само па сабе яшчэ не з'яўляецца заслугай, нават калі ўлічыць больш паглыбленае ўспрыманне Барты лёгкага і прыгожага французскага лірызму. Перыяд 1946—48 гадоў мастак праводзіць у Парыжы, дзе блізкасць да крыніц і непасрэдная сувязь з французскай школай яшчэ больш вытанчаюць яго густ да лёгкай грацыі гальскага пэндзаля. Гэта быў адзін з самых плённых перыядаў яго творчасці. Ён піша паветрана - празрыстыя нацюрморты, прыгожыя сілуэты жаночых фігур. Аднак з усімі гэтымі творамі венгерская публіка змагла пазнаёміцца толькі пасля 1967 года, таму што ўсе гэтыя гады мастак вёў амаль самотніцкі вобраз жыцця.

Ненадакучлівая стрыманасць і сціпласць найбольш характарызуюць Ласла Барту і як чалавека, і як творчую асобу. У яго жыцці і раней бывалі перыяды поўнага разрыву з грамадствам, калі ён адасабліваўся то ў размешчаным на беразе Балатона пасёлку Ціхані, то ў невялікім, але багатым помнікамі старыны гарадку Кесеге.

Пры гэтых асабістых схільнасцях яго замкнёнага характару тым больш дзіўным і ўражлівым становіцца цяперашні зварот мастака да грамадскай тэматыкі, якая раней амаль поўнасцю заставалася па-за яго ўвагай. Зразумела, і строгі выгляд металургічных камбінатаў, і лінейная логіка вакзалаў прапускаецца мастаком скрозь прызму яго асабістага ўспрымання. Таму нават індустрыяльныя пейзажы Ласла Барты заўсёды поўныя ўласцівай яму лірычнасцю і прыгажосцю. У гэтых карцінах можна адзначыць шмат блізкага да серый яго пейзажаў зімовага Балатона.

Апошняя выстаўка яго работ маслам і гуашшу, зробленых у 1970—71 гадах, найбольш канцэнтравана адлюстроўвала яго жыванісны стыль і вобразную сістэму. Нягледзячы на пэўную спрошчанасць, якая з'явілася ў яго ў апошнія гады, і лаканізм выяўленчых сродкаў, яго жыванісь ўсё ж не пераступіў парога так званага нонфігуратыўнага мастацтва і не стаў ні самамэтным, ні дэкаратыўным. Пацвярджае гэта серыя яго гуашаў пад назвай «Вайна», дзе сілуэты людзей, якія ледзь адрозніваюцца, бездапаможна прытуліліся адзін да аднаго пад пагражаючымі клубамі цёмных плям. І гэта серыя дае адчуць, наколькі шчыры і глыбокі роздум мастака-гуманіста аб агульначалавечых праблемах нашай эпохі.

«Венгерскія навіны».

ШТО БЫЛО, ТОЕ БЫЛО...

«ЯК У КІНО»



Часта, калі глядач бачыць штосьці нязвыклае, вострасюжэтнае, ён гаворыць: «Як у кіно». Гэтым ён нібыта сцвярджае незвычайнасць з'явы... Маўляў, сюжэт кінематаграфісты нярэдка выдумляюць толькі, каб прывабіць гледача. Што ж, у сцэнарыстаў сапраўды шырокае поле для фантазіі. Але сёння мы расказваем аб тым, чаго ніякая фантазія не прыдумала б, а ў жыцці вось— было...

●

Здымаўся эпізод фільма «Зімародак». Школьны клас, жывы куток.

— Увага. Цішыня ў павільёне. Матор! — скамандаваў рэжысёр В. Нікіфараў. І пасля невялікай паўзы — асістэнту:

— Шура, давай акцёра.

У кадры з'явіўся акцёр. За ім «пайшла» камера. Аўтар толькі адкрыў рот, каб сказаць першую фразу, як нехта паспешліва, але даволі гучна вымавіў:

— Шура, давай акцёра.

— Сто-о-оп! — закрычаў рэжысёр. — Выведзіце з пляцоўкі пабочных.

Вывелі. У павільёне засталіся толькі тыя, хто быў неабходны.

— Усе па сваіх месцах! Паўтараем спачатку! — грымеў голас Нікіфарава.

І вось усе на зыходных пазіцыях. Гучыць каманда рэжысёра:

— Увага. Матор. Пачалі!

У напружанай цішыні чуваць было, як шамаціць касцюм акцёра. І раптам — той жа голас:

— Шура, давай акцёра.

Усе, хто быў на здымачнай пляцоўцы, недаверліва пераглянуліся, а потым адначасова павярнулі галовы... на клетку з папугаем. А той, адчуўшы ўвагу да сябе, няспешна пераступіў з нагі на нагу, пачысціў пер'е і яшчэ выразна вымавіў:

— Шура, давай акцёра!

●

Здымкі фільма «Добрая справа» падыходзілі да фінішу. Заставалася адзняць апошні эпізод, дзе генерал шукаў унучку, якая заблудзілася ў мікрараёне.

— А ваш генерал не па форме апрануты, — раптам пачуўся за спіной рэжысёра Г. Харлана дзіцячы голас.

— Хлопчык, не замінай, — адмахнуўся дырэктар карціны.

Але хлопчык з партфелем не сунімаўся.

— Ваш генерал апрануты не па форме,— настойваў ён, але ні дырэктар, ні аператар Ю. Ялхоў, занятыя здымкай, не звярталі на яго ўвагі.

— Хлопчык, не чапляйся да людзей,— сказалі ў натоўпе гледачоў, і хлопчыка адцяснілі ў заднія рады.

Вярнуўшыся на студыю, нехта са здымачнай групы прапанаваў усё-такі праверыць яшчэ раз генеральскую амуніцыю. І высветлілася — на генеральскай фуражцы была какарда лётчыка грамадзянскай авіяцыі. Усе буйныя планы давялося перазняць. Вось што значыць не звяртаць увагі на дзяцей.

У Салігорску рэжысёр В. Шаталаў канчаў здымаць вялікі эпізод у шахце. Трэба было зняць заключны кадр: загружаны за рабочую змену стужкавы транспарцёр скіроўвае сільвініт у камеру драблення. У чаканні пуска здымачная група адпачывала.

Але вось да рэжысёра падышоў брыгадзір шахтапраходчыкаў і папярэдзіў, што праз мінуту транспарцёр будзе ўключаны.

— Святло! — прагучала каманда аператара. Успыхнулі асвятляльныя прыборы. — Эдзік, камеру!

Аператар нецярпліва азірнуўся навокал. Асістэнта не было. Тады аператар схапіў кінаапарат, які ляжаў непадалёк, і пачаў здымаць.

У кадры, пабліскваючы ў праменнях пражэктараў, праплывалі глыбы сільвініту. Камера, прасачыўшы за імі некаторы час, выйшла на агульны план...

Закончыўшы здымку, аператар, задаволены зробленымі кадрамі, стомлена апусціўся на кофр з-пад апарата.

Аднекуль з'явіўся асістэнт.

— Ты дзе быў? — бяскрыўдным тонам спытаў яго аператар.

— Хадзіў за плёнкай, у апараце яе няма,— спакойна адказаў асістэнт і пачаў перазараджаць камеру...

●

Ішлі пробы акцёраў на фільм рэжысёра І. Дабралюбава «Таму што люблю». Кансультантам па карціне быў маршал авіяцыі М. Скрыпко.



У павільён, дзе вялі пробныя здымкі, увайшоў акцёр, апрануты ў форму ваеннага лётчыка і, не зважаючы на маршала, прайшоў на здымачную пляцоўку...

Праглядваючы ў зале пробы, І. Дабралюбаў звярнуўся да маршала:

— Як вы лічыце, гэты акцёр падыходзіць на роль камандзіра?

На экране быў акцёр у форме лётчыка.

— Не, — катэгарычна адрэзаў маршал.

— Чаму? — здзівіўся Дабралюбаў.

— Што гэта за вайсковец, які не вітае старшага па чыну, нават калі ён і акцёр?

І. Дабралюбаў знайшоўся:

— Дык ён жа думаў, што вы таксама акцёр, таварыш маршал, таму і не звярнуў на вас увагі.

Абодва рассмяяліся...

●

Расказвае рэжысёр Р. Ясінскі:

— Прыехалі з аператарам Ул. Цеслюком у Белавежскую пушчу здымаць зуброў. Частка іх жыве ў вальеры, астатнія — у пушчы. Колькі мы ні намагаліся сустрэць «вольны» статак, нам усё не шанцавала. Вырашылі зняць тых, што ў вальеры. Але яны блізка да агароджы не падыходзілі. Тады мы з аператарам вырашылі забрацца ў вальер. Егеры нас папярэдзілі, што ні ў якім выпадку нельга бегчы ад зуброў, нават калі яны праявяць павышаную цікавасць да нас, няпрошаных гасцей.

І вось мы ў вальеры, недалёка паволі рухаецца статак. У цішыні добра чутно, як стракоча камера. Зубры спыніліся, павярнулі галовы ў наш бок. Двое ж, найболей цікаўныя, скіраваліся да нас. Да агароджы метраў 25—30, а наказ егераў ясны: не бегчы. Мы і стаялі. Але так і хацелася кожную хвіліну скочыць убок...

Зубр Пугінал, самы буйны з іх, падышоў зусім блізка, выцягнуў морду, пастаяў, панюхаў паветра і пайшоў за статкам.

У нас адлягло ад сэрца. А кадры ўдаліся добрыя!

●

Патанаючы ў глыбокім снезе, група ў пяць—шэсць чалавек марудна пасоўвалася па зімовым лесе. Наперадзе з кінакамерай напагатове крочыў аператар Г. Лейбман— здымаўся эпізод з мядзведзем для фільма «Бярэзінскі запаведнік».

З берлагу мядзведзя паднялі, і цяпер здымачная група ішла па яго слядах. Раптам егер спыніўся. За ім— уся група.

— Што такое? — у здзіўленні развёў ён рукамі.— Мы ж тут ужо ішлі... І, сапраўды, егер меў рацыю. Мы вярталіся па тых самых слядах.

Змяркалася. Аператар з непакоем пачаў пазіраць на неба — хутка нельга будзе здымаць. Егер уважліва вывучаў сляды.

— Мы за мядзведзем, а ён за намі! — нарэшце ўсклікнуў ён.

Тады насустрач мядзведзю вырашылі ісці ўдваіх: егер і аператар. Ішлі асцярожна, сляды пятлялі то ўправа, то ўлева па лесе. Але вось егер спыніўся і моўчкі паказаў у бок ельніку. За ім варушылася нешта чорнае.

Здымаць было ўжо амаль немагчыма. Аднак Лейбман усё ж ускінуў камеру і ўключыў матор.

Для таго, каб спалохаць мядзведзя, егер склаў рукі рупарам і крыкнуў. Чорнае заварушылася жывей. Аператар неяк дзіўна паглядзеў паўзверх камеры: ён пазнаў свайго асістэнта.

— Сюды, сюды,— замахаў рукамі асістэнт.— Тут мядзведзь, ён на дрэве сядзіць...

А. АЛАЙ.

Малюнкі Д. МІХЛЕЕВА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856. АТ 07489

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, выдавецтва —32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Х. Д. ЖЫЧКА.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО, Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ, Л. Я. ПРОКША, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.